Пачалася падпіска на «Звязду» на III квартал і II паўгоддзе 2016 года!

ПІШАМ ПРА ТОЕ, ШТО САПРАЎДЫ ВАЖНА

Падпісацца на газету можна ў любым аддзяленні паштовай сувязі; з дапамогай аплатна-даведачнага тэрмінала РУП «Белпошта»; праз сістэму «інтэрнэт-падпіска» на сайце www.belpost.by; у кіёсках «Белсаюздрука»; у паштальёнаў.

ЗАСТАВАЙЦЕСЯ З НАМІ — БУДЗЕ ЦІКАВА!

Падпіска, дарэчы, можа стаць добрым падарункам для вашых родных і блізкіх, для вашых сяброў.

Родная газета на роднай мове

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

ЗВЯЗДА

18 МАЯ 2016 г. СЕРАДА № 92 (28202) Кошт 2100 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

ВІЗІТ У ІТАЛІЮ І ВАТЫКАН

Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка 20-21 мая наведае з візітам Італьянскую Рэспубліку і Дзяржаву Ватыкан, паведамілі ў прэс-службе кіраўніка дзяржавы.

Праграмай візіту запланаваны перамовы з Прэзідэнтам Італьянскай Рэспублікі Серджыа Маттарэллай. На сустрэчы плануецца разгледзець увесь спектр беларуска-італьянскіх адносін з акцэнтам на гандлёва-эканамічнае і інвестыцыйнае ўзаемадзеянне, развіццё кааперацыйных сувязяў. Асаблівую ўвагу плануецца надаць фарміраванню паўнавартаснай нарматыўнай базы беларуска-італьянскага супрацоўніцтва.

Падчас візіту ў Дзяржаву Ватыкан адбудзецца сустрэча з Папам Рымскім Францішкам. На ёй будзе абмяркоўвацца далейшае развіццё супрацоўніцтва Беларусі з Рымска-каталіцкай царквой.

НА ЎСЕ РУКІ МАЙСТРЫ

Сістэма прафесійна-тэхнічнай адукацыі краіны пастаянна аптымізуецца і мадэрнізуецца

Пра гэта ішла размова на сустрэчы кіраўніка беларускай дзяржавы Аляксандра Лукашэнкі з прэзідэнтам міжнароднай некамерцыйнай асацыяцыі WorldSkills International Сайманам Бартлі.

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што Беларусь — адзіная на постсавецкай прасторы і, мабыць, ва Усходняй Еўропе краіна, дзе прафтэхадукацыі надаецца столькі ўвагі. «Сёння былыя рэспублікі Савецкага Саюза просяць нас, каб мы дапамаглі ім падрыхтаваць кадры па рабочых спецыяльнасцях, паколькі тая сістэма, якая была ў іх у часы Савецкага Саюза, аказалася разбуранай», — канстатаваў кіраўнік дзяржавы.

У Беларусі ж сістэму прафесійна-тэхнічнай адукацыі захавалі і ўдасканалілі. Працэс яе аптымізацыі, мадэрнізацыі працягваецца. «Гэта натуральна, яна павінна развівацца і аптымізавацца, мадэрнізавацца кожны год, — сказаў Прэзідэнт. — Беларусь будзе ўзорна-паказальнай краінай у плане развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі».

Важнае значэнне ў краіне надаецца стварэнню найноўшай матэрыяльна-тэхнічнай базы ўстаноў прафесійна-тэхнічнай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі. Гэта неабходная ўмова для таго, каб маладыя людзі маглі атрымаць самую сучасную спецыяльнасць і працаваць на самай сучаснай вытворчасці.

Вялікая ўвага надаецца таксама вытворчаму навучанню. «Мы робім усё для таго, каб чалавек, які прыйшоў для атрымання прафтэхадукацыі, мог з першага дня займацца сваёй прафесіяй. Каб ён змог ацаніць свае магчымасці, схільнасці да той ці іншай работы і азнаёміцца са сваёй будучай прафесіяй, зрабіць выснову, ці правільна ён арыентаваны і ці тая гэта праца, якой яму прыйдзецца займацца, магчыма, усё жыццё», — сказаў Аляксандр Лукашэнка.

Як адзначалася ў час сустрэчы, савецкі патэнцыял прафесійна-тэхнічнай адукацыі сябе вычарпаў, паведамляе прэс-служба Прэзідэнта. Сёння ў Беларусі імкнуцца рыхтаваць кадры пад патрэбнасці эканомікі. Для гэтага, напрыклад, структура падрыхтоўкі рабочых і спецыялістаў фарміруецца адрасна з улікам патрэбнасці арганізацый.

Падчас сустрэчы прэзідэнт WorldSkills International адзначыў, што беларускія напрацоўкі ў сферы развіцця прафесійна-тэхнічнай адукацыі важныя не толькі для краін СНД, але і для ўсёй сусветнай супольнасці.

ДЗЕЛЯ БАЛАНСУ

Аб'ём дзяржпадтрымкі прадпрыемстваў будзе зніжаны

Гэта вынікае з праекта ўказа «Аб мерах па забеспячэнні збалансаванасці бюджэту», які разглядаўся на нарадзе ў Прэзідэнта.

Раней указам кіраўніка дзяржавы №78, прынятым 23 лютага бягучага года, ураду было даручана прыняць вычарпальныя меры па аптымізацыі і скарачэнні выдаткаў бюджэту ў бягучым годзе ў мэтах яго збалансаванасці. У ліку гэтых мер — памяншэнне памераў дзяржпадтрымкі ў выглядзе пакрыцця і кампенсацыі працэнтаў па банкаўскіх крэдытах, якія прадастаўляюцца суб'ектам гаспадарання па дзяржаўных праграмах. Адпаведную стаўку кампенсацыі прапаноўвалася паменшыць на 2 працэнтныя пункты з адэкватным павелічэннем нагрузкі па абслугоўванні крэдытаў пазычальнікамі.

Прэзідэнтам па выніках нарады даручана дапрацаваць праект указа з тым, каб нагрузка, звязаная са зніжэннем дзяржпадтрымкі ў выглядзе пакрыцця (кампенсацыі) працэнтаў па крэдытах, клалася не толькі на крэдытаатрымальнікаў — суб'ектаў рэальнага сектара эканомікі, але раўнамерна і на банкаўскі сектар, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

У цэлым праект указа падрыхтаваны з мэтай скарачэння выдаткаў бюджэту. Рэалізацыя адпаведных норм дазволіць скараціць выдаткі рэспубліканскага бюджэту ў 2016 годзе на Br400 млрд, а ў 2017 годзе эканомія складзе Br500 млрд.

Пры гэтым, нягледзячы на плануемае ўдакладненне паказчыкаў бюджэту і аптымізацыю расходаў, усе сацыяльныя абавязацельствы дзяржава працягне выконваць у поўным аб'ёме.

ЗГАДКІ І СПАДЗЯВАННІ ГРАДА ТУРАВА

Сяргей МАРОЗ працуе галоўным захавальнікам Тураўскага музея ўжо не адзін год. Гасцям старажытнага горада яму заўсёды ёсць што паказаць і пра што расказаць. Адна з найпершых цікавінак Турава — рэшткі Траецкай царквы XI–XIII стагоддзяў, якія, раскапаныя некалькі гадоў назад археолагамі, захоўваюцца ў спецыяльнай скрыпце на Замкавай гары, побач з помнікам Кірылу Тураўскаму. А макет царквы ўсім, хто яго бачыць, дае надзею, што старажытны велічны храм паўстане калісьці ва ўсёй сваёй красе.

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ЛІЧБА ДНЯ

16 тысяч

даменаў «.бел» зарэгістравана ў нацыянальным інтэрнэт-сегменце. Колькасць зарэгістраваных тут імёнаў пастаянна расце. «У краіне створаны дастатковыя ўмовы, каб беларускі інтэрнэт не толькі функцыянаваў, але і паўнавартасна развіваўся. Без інтэрнэту немагчыма ўявіць сабе сучасны бізнес, распаўсюджванне інфармацыі, зносіны, культуру, забавы», — сказаў Сяргей Пракопаў, прадстаўнік Аператыўна-аналітычнага цэнтра пры Прэзідэнце Беларусі. Паводле яго слоў, пачынаючы з 2013 года Беларусь нязменна займае лідзіруючыя пазіцыі сярод еўрапейскіх дзяржаў па тэмпах росту нацыянальнай даменнай зоны. У 2016 годзе Беларусь пераадолела адзнаку ў 120 тыс. даменаў.

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 18.05.2016 г.

Долар ЗША	19247,00	▼
Еўра	21800,00	▼
Рас. руб.	298,17	▲
Укр. грыўня	762,33	▲

■ Перспектыва

ТРАНСГРАНІЧНЫ КАЛІДОР СУЧАСНАЙ ІНТЭГРАЦЫІ

Як працуе канцэпцыя Шаўковага шляху?

Першы цягнік з будаўнічымі матэрыяламі з Кітая для Кітайска-беларускага індустрыяльнага парка «Вялікі камень» прыбыў на сталічную грузавую таварную станцыю Калядзічы. Такім чынам, распрацаваны спецыялістамі трансгранічны транспартны калідор па сучасным «Шоўкавым шляху» пачаў дзейнічаць, паведаміў на цырымоніі прыбыцця цягніка з Паднябеснай у нашу краіну дырэктар «Чайна Мерчантс Груп», генеральны прадстаўнік прадстаўніцтва «Чайна Мерчантс Груп» у раёнах Цэнтральнай Азіі і Балтыі Ху ЧЖЭН.

Паводле яго слоў, матэрыялы, якія прыбылі ў Беларусь з Кітая, прызначаны для ўзвядзення камерцыйнага і лагістычнага цэнтраў кампаніі «Чайна Мерчантс Груп» — рэзідэнта парка «Вялікі камень». У большасці гэта металаканструкцыі.

Спадар Ху Чжэн патлумачыў, што на будаўніцтва першай чаргі адзначаных цэнтраў неабходна 9 тысяч тон металаканструкцый. Эксперты кампаніі вырашылі купіць у беларускіх вытворцаў каля 5,5 тысячы тон такіх канструкцый, а таксама прывезці з Кітая прыкладна 3,5 тысячы тон падобных грузаў. Ужо ўчора першы эксперыментальны цягнік новага трансгранічнага калідора даставіў у Беларусь 41 кантэйнер з 800 тонамі металаканструкцый. «Цягнік адправіўся з паўночнай правінцыі Кітая Хэбэй і прыбыў у Мінск. Ён праехаў праз Кітай, Казахстан, Расію і Беларусь. Гэта стала сапраўды трансгранічнай дастаўкай аб'ёмістых грузаў на вялікія адлегласці. Цягнік ехаў 16 сутак. Калі ажыццяўляць дастаўку морам, то спатрэбіцца як мінімум 45 сутак», — растлумачыў Ху Чжэн.

«Гэта значная падзея, — упэўнены дырэктар кампаніі, — бо ўпершыню грузы, прызначаныя для будаўніцтва індустрыяльнага парка «Вялікі камень», наўпрост прыбылі ў Мінск з Кітая». А яшчэ Ху Чжэн высока ацаніў працу Беларускай чыгункі і мытных службаў Беларусі.

СТАР. 2

■ Класныя навіны

АКТЫЎНАЯ АЦЭНКА — НОВАЯ МОДА?

Калі па-ранейшаму працаваць ужо немагчыма...

Тамара МАЦКЕВІЧ і Мікалай ЗАПРУДСКІ: «Ідэі, закладзеныя ў падмурак актыўнай ацэнкі, нарадзіліся на беларускай зямлі».

Метад актыўнай ацэнкі ўсё больш захоплівае беларускіх педагогаў. Яна становіцца ключавой як на ўроках, так і на экзаменах на пацвярджэнне вышэйшай катэгорыі. У конкурсе «Настаўнік года» паспяхова выступаюць тыя педагогі, якія ўжо асвоілі метад актыўнай ацэнкі. А некаторым яна дапамагла стаць і настаўнікам-метадыстам (гэту катэгорыю маюць у краіне сёння ўсяго 150 педагогаў).

Ёсць меркаванне, што школьная адукацыя ў будучыні зведае значныя змены: са школы знікнуць адзнакі, званкі, заўвагі ў дзённіках і выклікі бацькоў. А ў якасці альтэрнатывы ацэньвання застанецца толькі фіксацыя прагрэсу паспяховасці вучняў... Але пакуль што наша школа «танцуе» вакол адзнак, высокіх, сярэдніх і нізкіх. Вось толькі ці можа нізкі бал матываваць дзіця да навучання? Што працуе больш эфектыўна: адзнака ці вусны каментарый? Як правільна задаваць пытанні вучням і фармуляваць задачы на ўрок? Як займець у калектыве аднадумцаў і знайсці агульную мову з бацькамі? Усе гэтыя пытанні абмяркоўваліся падчас падагульняючай сустрэчы выпускнікоў чацвёртага дыстанцыйнага курса «Стратэгія актыўнай ацэнкі».

СТАР. 6

ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

Еўракамісія прызнала небяспеку лібералізацыі візавага рэжыму з Турцыяй

Тэрарысты атрымаюць больш магчымасцяў здзяйсняць напады на еўрапейскія краіны ў выпадку прадастаўлення грамадзянам Турцыі бязвізавага рэжыму. Пра гэта гаворыцца ў справаздачы Еўрапейскай камісіі, вытрымкі з якой надрукавала The Telegraph. «Можна чакаць, што, як толькі турэцкія грамадзяне атрымаюць бязвізавы ўезд у ЕС, замежнікі пачнуць спрабаваць атрымаць турэцкія пашпарты. Гэтая магчымасць можа прыцягнуць не толькі нелегальных мігрантаў, але і злачынцаў і тэрарыстаў», — гаворыцца ў дакуменце. Акрамя таго, турэцкія злачынныя групоўкі, якія спецыялізуюцца на транспарціроўцы і збыце наркотыкаў, кантрабандзе зброі, секс-трафіку рабынь і бежанцаў у Еўропу, могуць пагражаць краінам ЕС «прамой тэрытарыяльнай экспансіяй» — кажуць аўтары дакумента.

ЗША ўпершыню з 1974 года раскрылі суму доўгу перад Саудаўскай Аравіяй

Міністэрства фінансаў ЗША ўпершыню за больш чым 40 гадоў апублікавала звесткі аб суме доўгу перад Саудаўскай Аравіяй. Рашэнне не раскрываць запазычанасць перад Эр-Рыядам было прынята ў 1974 годзе пасля таго, як арабскія краіны ўвялі эмбарга на пастаўкі нафты ў Злучаныя Штаты. Па звестках на сакавік гэтага года, доўг ЗША перад Эр-Рыядам склаў 116,8 мільярда долараў. Саудаўская Аравія ўваходзіць у дзясятку асноўных крэдыторaў ЗША.

Фінляндыя назвала ўмову ўступлення ў НАТО

Прэзідэнт Фінляндыі Саулі Нііністэ лічыць, што пытанне аб магчымым уступленні краіны ў НАТО неабходна вырашаць на агульнанацыянальным рэферэндуме. «Для таго, каб у Фінляндыі нешта змянілася ў пытанні [членства ў НАТО], павінна змяніцца грамадская думка. На маю думку, гэта няправільна, што ў народа нічога не трэба пытацца праз рэферэндум, бо народ не разумее многіх рэчаў і дае няправільныя адказы. У нас быў рэферэндум па далучэнні да Еўрапейскага саюза. У цяперашняй сітуацыі я лічу ўступленне ў НАТО яшчэ больш важнай тэмай», — заявіў Нііністэ. Паводле яго слоў, у краіны хапае магчымасцяў для захавання сваёй бяспекі.

ISSN 1990 - 763X

КАРАТКА

Хакеісты зборнай Беларусі ў заключным матчы чэмпіянату свету ў групе В абыгралі сапернікаў з Францыі з лікам 3:0 і захавалі прапіску ў топ-дывізіёне.

Ніякіх абмежаванняў для бясплатнага Wi-Fi ў Беларусі няма, заявіў першы намеснік міністра сувязі і інфарматызацыі Дзмітрый Шадко на першым нацыянальным форуме па кіраванні інтэрнэтам.

Дзяржаўтаінспекцыя правядзе спецыяльнае комплекснае мерапрыемства «Увага — дзеці!» з 25 мая па 5 чэрвеня.

Конкурс сярод школ па зборы другаснай сыравіны «Планета без адходаў» аб'яўлены ў Беларусі.

У Лондане прайшло ўручэнне Міжнароднай Букераўскай прэміі 2016 года. Узнагароду атрымала пісьменніца з Паўднёвай Карэі Хан Канг за раман «Вегетарыянка», а таксама перакладчыца гэтай кнігі на англійскую мову Дэбара Сміт.

ВАДА ЗБІРАЕ АХВЯРЫ

Не так даўно ў Гомелі адбыўся трагікамічны выпадак. 1 мая на адным з вадаёмаў у межах горада адпачывала кампанія. Ратаўнікам паступіла паведамленне аб тым, што адзін з яе ўдзельнікаў прапаў. На беразе засталіся дакументы, вопратка, асабістыя рэчы, ключы ад кватэры... Менавіта таму асобу зніклага ўстанавілі вельмі хутка. Першая ж думка, якая ўзнікла ў спецыялістаў, — патануў, небарака. Цела шукалі некалькі дзён, але так і не знайшлі.

І вось праз 12 дзён зніклы чалавек знайшоўся... дома! Пасля аказалася, што ён перабраў спіртнога і ўрэшце прачнуўся ў пералеску побач з вадаёмам глыбокай ноччу. Пашукаў свае рэчы, але безвынікова. І пайшоў дадому. Некаторы час правёў у суседа, а пасля нейкім чынам усё ж трапіў у сваю кватэру. Так і правёў дэкаду ў «падвешаным стане» — па дакументах тапельцам, а ў рэальнасці жывым...

ВОРАГ З «ГРАДУСАМІ»

— Звычайна патанулых, якія перад заходам у ваду ўжывалі спіртное, 40-50% ад агульнай колькасці, — кажа **вядучы спецыяліст Таварыства ратавання на водах Алег БАРАЗНА**. — Сёлета, напрыклад, з трох чалавек, якія патанулі ў адкрытых вадаёмах падчас новага купальнага сезона, двое былі ў нецвярозым стане. У пачатку красавіка на рацэ Друць на Рагачоўшчыне загінуў 20-гадовы хлопец. Разам са сваімі таварышамі ён адпачываў на беразе.

Выпіў і пайшоў у ваду. Адплыў пятнаццаць метраў ад берага і схаваўся пад вадой. Калі яго ўсё ж выцягнулі на паверхню, вярнуць да жыцця не здолелі. Ці вось у мінулым жа месяцы здарылася бяда ў вёсцы Савасцьянавічы ў Магілёўскім раёне. Тры метры літаральна праплыў ад берага і пайшоў на дно. А каб патануць, дастаткова зусім невялікай колькасці вады. Паказальная ў гэтым плане гісторыя адбылася летась на вадасховішчы Дразды на адным з пляжаў. Хлопцы, якія там заходзілі ў ваду, наступілі на цела. Глыбіня была зусім невялікая — 50 сантыметраў, гэта прыкладна па калена. Выцягнулі мужчыну на бераг. Але ўратаваць яго не ўдалося...

СТАР. 6

Увага: прамая лінія!

УСЁ, ШТО ВЫ ХАЦЕЛІ ДАВЕДАЦЦА ПРА ПЕНСІІ

Ці павялічыцца перадпенсійны тэрмін, у якім працадаўца не мае права не падоўжыць вам кантракт? Як будуць плаціць пенсію тым, хто працаваў за мяжой? Калі будуць выходзіць на пенсію ваенныя і міліцыя? Якая выслуга гадоў зараз будзе патрэбна дзяржслужачым? На гэтыя і іншыя пытанні вам адкажуць **спецыялісты Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Беларусі — начальнік упраўлення арганізацыі пенсійнага забеспячэння ДРОНАВА Алена Уладзіміраўна і кансультант упраўлення пенсійнага заканадаўства САМАДУМСКАЯ Аляксандра Вітальеўна** — падчас «прамой лініі», якая адбудзецца ў «Звяздзе» **19 мая з 11.00 да 12.00. Тэлефануйце: 8 (017) 287-18-71.**

Папярэднія пытанні можна задаць 18 мая па нумары 8 (017) 287-17-50 або даслаць (з пазнакай «Прамая лінія») на электронны адрас info@zviazda.by або па пошце: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10А.

V Усебеларускі народны сход

Ігар БУЗОЎСКІ:

«УСЕБЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ СХОД ПРАКТЫЧНА ПАЧАЎСЯ»

Прапрацоўка кожнага пасылу, што ўтрымліваецца ў Пасланні, — гэта фактычна і ёсць падрыхтоўка да Усебеларускага сходу. На гэтым зрабіў акцэнт Ігар БУЗОЎСКІ, намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта нашай дзяржавы, перад пачаткам рэспубліканскай нарады ідэалагічнага актыву, што прайшла ўчора ў Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце.

Фота БЕЛТА.

— Вертыкаль, што сабралася ў Акадэміі кіравання, — гэта людзі, прызваныя прафесійна прааналізаваць сітуацыю па падрыхтоўцы да будучых кампаній, — заўважыў намеснік Кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта, — гэта і падрыхтоўка да Усебеларускага сходу, і выбарчая кампанія ў парламент — значныя, стратэгічныя мерапрыемствы.

Ігар Бузоўскі падкрэсліў, што асаблівую ўвагу ідэолагі павінны надаць Пасланню кіраўніка дзяржавы. Па яго словах, канцэптуальныя рэчы, закладзеныя ў Пасланні, стануць асновай у тым ліку «для абмеркавання на Усебеларускім народным сходзе стратэгічных падыходаў у эканамічным і сацыяльна-палітычным развіцці Рэспублікі Беларусь».

— Мы не раз казалі пра тое, што Усебеларускі народны сход практычна пачаўся, паколькі вылучэнне дэлегатаў, кандыдатаў для ўдзелу ў ім — гэта ўжо практычна Усебеларускі народны сход, — зазначыў прадстаўнік Адміністрацыі Прэзідэнта. — Гэта вызначэнне лідараў, вызначэнне тых «болевых пунктаў», якія неабходна было б абмеркаваць, тых прапаноў, што дазваляюць выбудаваць стратэгію развіцця Рэспублікі Беларусь.

Па словах Ігара Бузоўскага, пытанні для абмеркавання сёння знаходзяцца ў асноўным у эканамічнай плоскасці.

— Ні для каго, зноў жа, не сакрэт, што першапачаткова пасыл такога кансалідаванага меркавання, якое выпрацоўваецца дэлегатамі ад усёй рэспублікі, быў нацэлены на эканоміку, — нагадаў намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта. — Чаканні вялікія і ў вызначэнні стратэгіі, у вызначэнні ў першую чаргу эканамічных пасылаў, якія сёння абмяркоўваюцца самымі рознымі слаямі насельніцтва — не толькі эканамістамі.

У гэтым рэчышчы, на думку Ігара Бузоўскага, паняцці ідэалогіі і ідэалогіі эканомікі павінны быць сумяшчальнымі — «як адзінае паняцце, што дазваляе сфарміраваць стратэгію развіцця дзяржавы».

— Ідэалогія эканомікі — гэта разуменне, якім чынам мы будзем выбудоўваць эканамічную стратэгію ў галіне прыватызацыі, у галіне развіцця прадпрыемстваў, падтрымкі сацыяльных стандартаў, — патлумачыў ён. — Гэта глабальныя пытанні, якія, здавалася б, заключаюцца ў нейкіх макрапаняццях, але ў той жа час яны маюць прыватны, канкрэтны, прадметны характар. Дэлегаты, якія прыедуць на Усебеларускі народны сход, прывязуць гэту канкрэтыку і данясуць да прысутных стратэгіі, якія мы выпрацуем усёй краінай.

Марат ЖЫЛІНСКІ, рэктар Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце, член Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу па адукацыі, культуры і навуцы, звярнуў увагу на тое, што сёлета ў краіне тры важнейшыя грамадска-палітычныя мерапрыемствы.

— Гэта Пасланне, V Усебеларускі народны сход і, безмоўна, парламенцкія выбары, — пералічыў ён. — Мэта сённяшняга мерапрыемства — збор ідэалагічнага актыву рэспублікі на базе Акадэміі кіравання. Як кажуць у народзе, «зверка гадзіннікаў»: для таго, каб абмеркаваць, падняць нейкія пытанні — у тым ліку і тыя, якія будуць узняты на Усебеларускім сходзе.

Па словах рэктара Акадэміі кіравання, на Усебеларускім сходзе будзе абмяркоўвацца «бізнес-план» краіны на «пяцігодку».

— Безумоўна, будзе зроблена «работа над памылкамі», — лічыць Марат Жылінскі. — Чаго дасягнулі, чаго не і, самае галоўнае, якія прычыны гэтага. Ідэалагічны актыў у гэтым плане таксама ставіць перад сабой задачы прааналізаваць, што адбылося за пяцігодку.

Аляксей ДЗЕРБІН, дырэктар Інфармацыйна-аналітычнага цэнтра пры Адміністрацыі Прэзідэнта, паведаміў, што напярэдадні Усебеларускага народнага сходу насельніцтва нашай краіны настроена пазітыўна. На яго думку, адной з асноўных тэм на сходзе стане Праграма сацыяльна-эканамічнага развіцця.

— Гэта сапраўды тая тэма, якая закранае актуальныя для насельніцтва пытанні, — лічыць ён.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Ва ўрадзе

ЭКАНАМІЧНАЯ АДЛІГА

Саўмін адзначае паступовы рост эканомікі ў краіне

Лепшыя паказчыкі, чым тыя, што былі ў прагнозах, адзначылі на пасяджэнні Савета Міністраў па падвядзенні вынікаў сацыяльна-эканамічнага развіцця краіны за першы квартал года. Па словах Андрэя КАБЯКОВА, прэм'ер-міністра нашай краіны, айчынны ВУП у апошнія месяцы мае станоўчую дынаміку росту.

— Па аператыўных звестках Белстата, за чатыры месяцы ВУП склаў 97,0%. За красавік мы падраслі на 0,6 пункта. У нас назіраецца досыць паслядоўная карціна: студзень — 95,7% ВУП, студзень-люты — 96%, першы квартал — 96,4%, 4 месяцы — 97,0%. У прынцыпе відавочная дынаміка вяртання на траекторыю эканамічнага росту, — паведаміў кіраўнік Саўміна.

Па словах прэм'ера, урад і Нацыянальны банк Беларусі рэалізуюць меры макраэканамічнай балансіроўкі ў знешнепалітычных умовах, якія значна адрозніваюцца ад тых, на базе якіх быў сфарміраваны прагноз на 2016 год. Цана на нафту прагназавалася на ўзроўні 50 долараў за бараль. У першым квартале яна склала 32 долары. У той жа час меркавалася, што курс расійскага рубля будзе ў раёне 63 за долар, а ў выніку склаў 74,6.

Таксама планавалася, што ў нашага асноўнага гандлёвага партнёра — Расійскай Федэрацыі — эканамічны рост не толькі не будзе памяншацца, а застанецца на ўзроўні 100%. Па факце ён сёння 98,8%. «Мы меркавалі, што сяроднегадавы курс беларускага рубля да долара ЗША будзе на ўзроўні 18 689. У першым квартале значэнне склала 20 755 рублёў за долар», — адзначыў старшыня ўрада.

На думку Андрэя Кабякова, тэмпы макраэканамічнай балансіроўкі не маглі не адбіцца на тэмпах развіцця эканомікі, перш за ўсё ў яе рэальным сектары. Так, ВУП за першы квартал адстае ад прагнознага на 2,5% (96,4% да 98,9%). Тым не менш тэмп росту прамысловасці, няхай і ніжэйшы за 2015 год, але вышэйшы за прагноз, склаў у першым квартале 95,7% да прагназуемых 95%. За чатыры месяцы гэты паказчык вырас ужо да 97,5%.

Прытым на дзве траціны адставанне ад прагнозу на першы квартал адбылося за кошт зніжэння валавой дабаўленай вартасці (ВДВ) па секцыі «будаўніцтва». Яшчэ трэцяя частка звязана з запавольваннем грузаперавозак і аптовага тавараабароту. З плюсам па ВДВ у першым квартале спрацавала толькі сельская гаспадарка — 102%. Прытым адбылося значнае вартаснае падзенне аб'ёмаў экспарту — на 16,7%. Нягледзячы на макраэканамічныя складанасці, якія напаткалі апошнім часам нашу краіну, прэм'ер адзначыў цалкам станоўчую дынаміку росту асноўных эканамічных паказчыкаў.

Вераніка ПУСТАВІТ. *pustavit@zviazda.by*

ТРАНСГРАНІЧНЫ КАЛІДОР...

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

«Беларускія спецыялісты паказалі высокую кампетэнтнасць і прафесіяналізм у прыёме грузу, забяспечылі якаснае абслугоўванне. Дзяржаўны мытны камітэт таксама аказаў вялікае садзейнічанне нашай працы і аператыўна ажыццявіў мытнае афармленне, забяспечыў хуткую растаможку і прыём грузаў», — паведаміў кіраўнік кітайскага прадпрыемства.

Ён выказаў надзею, што па меры развіцця індустрыяльнага парка «Вялікі камень» усё больш і больш грузаў будуць дастаўляцца менавіта чыгункай. Тут спадзяюцца, што кошт кантынентальнай транспарціроўкі будзе паступова памяншацца. Гэтаму павінна паспрыяць і больш поўная загрузка транспартнага кантэйнернага калідора ў два бакі, у тым ліку за кошт грузаў з беларускай прадукцыяй у Кітай.

Спецыялісты кампаніі «Чайна Мерчантс Груп» разлічваюць, што гандлёва-лагістычны субпарк у Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень» цалкам пачне дзейнічаць ужо ў наступным годзе. У цэлым інвестыцыі гэтай кампаніі ў праект складуць 500 млн долараў, а агульная плошча субпарка будзе дасягаць аднаго квадратнага кіламетра.

Менавіта ў дзень прыбыцця першага прамога грузавога цягніка з правінцыі Хэбэй, на станцыі Калядзічы адразу шэраг кампаній з Беларусі і Кітая падпісалі пратаколы аб намеры выкарыстоўваць склад захоўвання, выставачны і бізнес-цэнтр ЗАТ «Чайна Мерчантс СіЭйчЭн-БіЭлАр Камерцыйная і Лагістычная Кампанія», якія будуць пабудаваны ў Кітайска-беларускім індустрыяльным парку «Вялікі камень».

На цырымоніі прысутнічаў і **намеснік міністра эканомікі Беларусі, часовы кіраўнік дзяржаўнай установы «Адміністрацыя Кітайска-беларускага парка» Індустрыяльны парк «Вялікі камень» Аляксандр ЯРАШЭНКА**, які ўпэўнены, што кампанія «Чайна Мерчантс Груп» з'яўляецца сёння галоўным рэзідэнтам парка з пункту гледжання развіцця транспартнай лагістыкі.

Паводле яго слоў, падпісанне пратаколаў аб намеры выкарыстоўваць склад захоўвання, выставачны і бізнес-цэнтр гэтай кампаніі з'яўляецца ключавой падзеяй у развіцці парка. «Прыемна адзначыць, што сярод кампаній, якія падпісалі пратаколы, ёсць і беларускія. Напрыклад, шклозавод «Нёман». Мы чакаем, што такое супрацоўніцтва дазволіць прадпрыемству значна скараціць выдаткі пры пастаўках сваёй прадукцыі ў далёкае замежжа», — сказаў Аляксандр Ярашэнка.

• Дарэчы

НАШЫ ВЫТВОРЦЫ ГАТОВЫ ВЫЙСЦІ НА КІТАЙСКІ РЫНАК ПА НОВАЙ ЛАГІСТЫЦЫ

Шклозавод «Нёман» стаў адным з першых прадпрыемстваў нашай краіны, які яшчэ летась пачаў актыўна супрацоўнічаць з камерцыйнай кампаніяй «Чайна Мерчантс Груп» па лініі паставак сваёй прадукцыі на кітайскі рынак.

Начальнік упраўлення па продажы шклопрадукцыі на экспарт завода «Нёман» Аксана АПАНАСЕНКА паведаміла рэдакцыі, што першыя кантакты з гэтай кампаніяй іх прадпрыемства пачало наладжваць яшчэ ў сярэдзіне мінулага года. «З іх дапамогай мы ўжо адправілі адзін кантэйнер беларускага хрусталю ў Кітай. Пасля падпісання пратакола аб намеры супрацоўніцтва мы разлічваем, што спецыялісты гэтай кампаніі будуць і надалей дапамагаць нам прадаваць нашу прадукцыю ў гэту краіну», — расказвае Аксана Апанасенка.

— Першы кантэйнер ад вас у Паднябесную быў адпраўлены марскім шляхам?

— Так. Эксперыментальная пастаўка нашага хрусталю на суму каля 30 тысяч долараў была адпраўлена на поўдзень Кітая ў горад Шэньчжэнь. Зразумела, што пастаўкі па моры значна таннейшыя, чым па сушы, але ажыццяўляюцца яны даволі працяглы час. Наш кантэйнер прыбыў на месца толькі праз два месяцы. Агучаная ў Калядзічах лагістыка новага транспартнага калідора (15—16 сутак) робіць камерцыйныя пастаўкі сапраўды аператыўнымі. Між іншым, у далёкае замежжа (Чылі, ЗША) асобныя тэрміновыя заказы мы дастаўлялі нават авіятранспартам. Таму мы будзем разглядаць перспектыву паставак беларускага хрусталю і па чыгунцы.

— Якія ў вас планы па развіцці гэтага кітайскага напрамку?

— Мы яго толькі пачынаем развіваць, але ўжо цяпер можна адзначыць адкрытую цікавасць да нашай прадукцыі з боку кітайскага кіраўніцтва і спецыялістаў кампаніі. Непасрэдна беларускі хрусталь толькі днямі трапіў у кітайскія крамы. Калі на наш тавар там будзе попыт, то мы атрымаем сур'ёзнага пакупніка. А рынак Кітая вельмі вялікі, наш завод можа адшукаць сваю нішу. Калі справа пойдзе ўгору, то мы гатовы накіроўваць туды больш аб'ёмныя пастаўкі.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

■ Парламенцкія выбары

УРОКІ ТАЛЕРАНТНАСЦІ

Лідзія Ярмошына — пра новыя нюансы ў выбарчай кампаніі

Інстытут члена акружной камісіі з правам дарадчага голасу спросціць работу палітычных партый падчас будучых выбараў у Палату прадстаўнікоў. Такое меркаванне выказала старшыня Цэнтральнай камісіі па выбарах і правядзенні рэспубліканскіх рэферэндумаў Лідзія ЯРМОШЫНА на ўчарашнім пасяджэнні Цэнтрвыбаркама.

Працаваць з апанентамі

«Думаю, гэта спросціць работу для палітычных партый — значыць у іх будзе не адзін прадстаўнік пры афіцыйнай выбарчай акрузе, а гіпатэтычна іх можа быць і 110, — адзначыла Лідзія Ярмошына. — Гэта магчыма, калі партыя вылучыла сваіх прадстаўнікоў па 110 акругах».

На яе думку, такое наваўвядзенне на будучых парламенцкіх выбарах — урок талерантнасці і ўмення працаваць з апанентамі. Перш за ўсё, гэта тычыцца мясцовых улад. «Мясцовыя выбарчыя органы павінны будуць працаваць з прадстаўнікамі апазіцыйных структур як са сваімі калегамі і вучыцца слухаць іншы пункт гледжання», — заўважыла старшыня Цэнтральнай камісіі.

Яна таксама звярнула ўвагу, што да парламенцкай кампаніі зменены парадак аспрэчвання ўсіх канкрэтных сітуацый, якія ўзнікаюць падчас выбараў. Так, калі раней адмова ў рэгістрацыі кандыдата ў дэпутаты магла абскарджвацца толькі ў Цэнтральнай камісіі, а далей рашэнне Вярхоўнага суда з'яўлялася канчатковым, то зараз рашэнне акруговай камісіі абскарджваецца ў тэрытарыяльнай камісіі, рашэнне абласной тэрытарыяльнай камісіі — у абласным (мінскім гарадскім) судзе. Пры гэтым рашэнне суда абласнога ўзроўню з'яўляецца канчатковым. Ні ў Цэнтральную камісію, ні ў Вярхоўны суд справа не ідзе.

Нагадаем, на сёлетніх выбарах кандыдат у дэпутаты не зможа стаць даверанай асобай іншага кандыдата, а вылучацца можна будзе толькі па адной акрузе. Адна з найважнейшых навел датычыцца падвядзення вынікаў выбараў — яно спрашчаецца. Раней выбары ў парламент маглі праходзіць у два туры, цяпер жа на іх распаўсюджваецца прынцып адноснай большасці.

Назіральнікаў запросіць МЗС

Падчас размовы з журналістамі старшыня ЦВК адзначыла, што Міністэрствам замежных спраў з нагоды выбараў будуць накіраваны афіцыйныя лісты ў міжнародныя арганізацыі, якія займаюцца маніторынгам і з'яўляюцца найбольш аўтарытэтнымі ў гэтай галіне.

«Яны будуць самастойна фарміраваць місіі, — заўважыла яна. — Гэта могуць быць місіі АБСЕ, СНД, Савета Еўропы. Еўрапарламент таксама заяўляе пра сваё жаданне. Гэта ўжо, у прынцыпе, структура Еўрапейскага саюза».

Што да Цэнтрвыбаркамаў краін Еўрасаюза, то беларускі ЦВК накіроўвае запрашэнні толькі дзвюм еўрапейскім камісіям — Літвы і Латвіі.

Рэкамендацыі БДІПЧ АБСЕ ўлічаны часткова

Па словах Лідзіі Ярмошынай, ужо на працягу цяперашняй выбарчай кампаніі наша краіна ўлічыць частку рэкамендацый БДІПЧ АБСЕ, якія былі дадзены пасля правядзення ў Беларусі прэзідэнцкіх выбараў.

«Па выніках прэзідэнцкіх выбараў БДІПЧ АБСЕ было дадзена 30 рэкамендацый, 22 з іх патрабуюць унясення змяненняў у выбарчае заканадаўства, — паведаміла старшыня Цэнтральнай камісіі. — Мы не можам зрабіць гэта цяпер, паколькі стартуе новая выбарчая кампанія. Аднак частка прапаноў будзе рэалізавана ў выглядзе паляпшэння правапрымяняльнай практыкі».

На ўчарашнім пасяджэнні зацвярджаліся метадычныя рэкамендацыі для ўчастковых выбарчых камісій. У прыватнасці, у дакументе змяшчаецца норма аб тым, што назіральнікі могуць прысутнічаць пры падліку галасоў, вызначана месца іх знаходжання каля стала для падліку галасоў, іх правы і абавязкі. «Паляпшэнне сітуацыі з доступам назіральнікаў да працэдуры падліку галасоў — гэта і ёсць паляпшэнне правапрымяняльнай практыкі, якое мы можам зрабіць у рамках рэкамендацый БДІПЧ», — сказала Лідзія Ярмошына.

Акрамя таго, будзе павышана празрыстасць пры разглядзе выбарчых спрэчак. Гэта азначае, што ўсе рашэнні выбарчых камісій, прынятыя ў сувязі са скаргамі, павінны публікавацца ў інтэрнэце — размяшчацца на сайце. Яшчэ адна абавязковая ўмова — павышэнне галоснасці, дыскусійных пасяджэнняў выканаўчых органаў пры зацвярджэнні складу выбарчых камісій. «Тыя навелы, якія ўвайшлі ў метадычныя тлумачэнні, гэта, перш за ўсё, рэкамендацыі міжнародных выбарчых экспертаў», — сказала старшыня Цэнтрвыбаркама. Яна таксама падкрэсліла, што ўказанне ЦВК з'яўляецца абавязковым да выканання камісіямі на месцах.

Надзея ЮШКЕВІЧ. *yushkevich@zviazda.by*

■ Узровень

ПАД ЗНАКАМ МІЛАСЭРНАСЦІ

Выстаўка «Іканапіс Беларусі XVII–XXI стагоддзяў» адкрываецца сёння ў музеі Ватыкана.

Да 25 ліпеня ў музеі Ватыкана ўпершыню будуць прадстаўленыя 33 іконы беларускіх іканапісцаў з калекцыі Нацыянальнага мастацкага музея Беларусі і Дома міласэрнасці. Чакаецца, што выстаўка будзе цікавая не толькі турыстам, але і спецыялістам.

Экспазіцыя прымеркавана да Святога Года Міласэрнасці, які праходзіць пад дэвізам «Міласэрныя, як Айцец» з 8 снежня 2015 па 20 лістапада 2016 года.

Арганізатарам і ўдзельнікам гэтай знакавай падзеі даслаў віншаванне Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка. «Гэты ўнікальны праект, які праходзіць у аб'яўлены ў Беларусі Год культуры, дэманструе непарыўныя духоўныя і эстэтычныя сувязі еўрапейскіх народаў, іх адданасць рэлігійным ідэалам і каштоўнасцям», — гаворыцца ў віншаванні.

Таксама кіраўнік дзяржавы адзначыў, што паказ нацыянальнага іканапісу Беларусі ў сценах музея Ватыкана з'яўляецца знакавай падзеяй і важным крокам на шляху асэнсавання бясцэннай спадчыны беларускай культуры, неад'емнай часткай якой ёсць хрысціянскае мастацтва ■

■ Разумныя грошы

ГЭТЫ «ПЛАСТЫК» НЕ КУСАЕЦЦА

Нацбанк Беларусі распрацаваў дакладныя рэкамендацыі па бяспечным выкарыстанні банкаўскіх картак

Гэты зручны плацежны сродак з'явіўся ў нас ўжо больш за 10 гадоў таму. На першым этапе ўкаранення безнаяўных разлікаў асноўная маса насельніцтва звычайна здымала ўсю суму грошай з зарплатных картак, каб карыстацца пры разліках менавіта банкнотамі. Потым банкаўскія структуры заварушыліся і пачалі завабліваць сваіх кліентаў рознымі перавагамі менавіта гэтага спосабу разлікаў практычна ва ўсіх сферах. Віртуальны кашалёк пачаў набываць у насельніцтва ўжо сапраўдную масавую папулярнасць, але... Аказалася, што правільна карыстацца даўно атрыманымі карткамі дагэтуль не ўсе навучыліся. Наш нацыянальны фінансавы рэгулятар вырашыў выправіць гэтую сітуацыю і падрыхтаваў для насельніцтва пакрокавы дапаможнік. Такую інструкцыю на ўсе выпадкі «безнаяўнага жыцця». Гэты банкаўскі фаліянт мы папулярна пераказалі і прапануем вам. Гэта будзе цыкл матэрыялаў пад рубрыкай «Разумныя грошы». Першы з іх тычыцца агульных рэкамендацый.

У СТАТУСЕ СУР'ЁЗНАГА ДАКУМЕНТА

Пры атрыманні карткі неабходна распісацца на яе адваротным баку ў спецыяльным полі. Наяўнасць асабістага подпісу знізіць рызыку выкарыстання яе іншымі асобамі ў выпадку страты або крадзяжу карткі. Больш за тое, пры адсутнасці ўзору ўласнага почырку альбо несапраўднасці подпісаў на картцы і карт-чэку трымальніку карткі можа быць адмоўлена ў правядзенні аперацыі з яе выкарыстаннем.

Адразу трэба захаваць нумар карткі і нумар тэлефона службы кліенцкай падтрымкі банка, які яе выдаў. Гэтая інфармацыя можа дапамагчы для блакіравання карткі ў выпадку яе страты альбо крадзяжу. Трымаць нумар тэлефона службы кліенцкай падтрымкі банка, які выдаў картку, лепш у лёгкадаступным месцы (напрыклад, у памяці мабільнага тэлефона ці нататніку).

Асобна ў рэкамендацыі гаворыцца пра ўмовы захоўвання карткі, якія павінны выключаць усялякую магчымасць яе страты, псавання, капіравання інфармацыі, а таксама несанкцыянаванага і незаконнага выкарыстання. Картка з'яўляецца даволі сур'ёзным дакументам, таму ставіцца трэба да яе далікатна. Пластык не любіць любой дэфармацыі, забруджвання, уздзеяння высокіх і нізкіх тэмператур, электрамагнітных палёў, прамых сонечных прамянёў, вільгаці, фарбавальнікаў, растваральнікаў, шкодных хімічных рэчываў і іншых неспрыяльных фактараў, якія могуць прывесці да яе функцыянальнай «гібелі». Да апошняй рэкамендацыі я параіў бы паставіцца больш сур'ёзна. Напрыклад, мая дачка звычайна захоўвала свой пластык у адным футарале са смартфонам. Праз паўгода такога суседства з актыўным тэлефонам магнітная паласа карткі пачала змяняць сваю структуру і «заглючыла». Потым мы вымушаны былі рабіць дублікат карткі, на што страцілі цэлы тыдзень.

КАРТАК МНОГА НЕ БЫВАЕ

Эксперты Нацбанка ўпэўнены, што неабходна выкарыстоўваць розныя карткі для ажыццяўлення штодзённых плацяжоў, плацяжоў у інтэрнэце, а таксама ў замежных паездках: для кожнага тыпу плацяжоў варта афарміць асобны рахунак і выпусціць да яго картку. Увогуле, для ажыццяўлення плацяжоў за мяжой пажадана афарміць да аднаго рахунку некалькі картак розных плацежных сістэм і захоўваць іх асобна адну ад адной. Менавіта гэта зможа пазбавіць кліентаў ад непрыемных «сюрпрызаў» у месцах, дзе прымаюцца карткі не ўсіх плацежных сістэм.

Лепш не захоўваць вялікія сумы грошай на картках, якімі вы карыстаецеся нерэгулярна: напрыклад, картку для аплаты ў інтэрнэце варта папаўняць менавіта на тую суму, якую плануецца выдаткаваць, і непасрэдна перад самым плацяжом. Права карыстання карткай мае толькі яе законны трымальнік. Пры необходнасці прадастаўлення доступу да свайго рахунку іншых людзей трэба звярнуцца ў банк, які выдаў картку, для афармлення дадатковага пластыку.

Менавіта такую дадатковую картку, якая «прывязана» да майго кашалька, я афармію сваёй малодшай дачцэ. Зручна і бяспечна. Справа ў тым, што розніца паміж нашымі карткамі ў вызначаных лімітах — дачка можа зняць з майго рахунку не больш за 200 тысяч рублёў у дзень.

ПІН-КОД — НІКОМУ

Схавайце далёка-далёка ад іншых асоб канфідэнцыйныя даныя карткі: нумар і тэрмін дзеяння яе, пазначаны на адваротным баку трохзначны код праверкі сапраўднасці (пры яго наяўнасці) і ПІН-код, які пажадана запомніць. У выпадку, калі з запамінаннем лічбаў у чалавека ёсць цяжкасці, то такі код неабходна захоўваць асобна ад карткі ў няяўным выглядзе (напрыклад, перапісаўшы яго на лісток паперы сярод іншых груп лічбаў або любой іншай інфармацыі) або змяніць яго на больш зручны (пры наяўнасці такой паслугі ў банка, які выдаў картку).

Ніколі не паведамляйце ПІН-код іншым асобам. Нікому, уключаючы сваякоў, знаёмых, работнікаў банкаў, арганізацый гандлю (сэрвісу) і прадстаўнікоў праваахоўных органаў. Нельга перадаваць ПІН-код ні па тэлефоне, ні па электроннай пошце. Толькі трымальнік карткі павінен ведаць свой ПІН-код. Гэта правіла не павінна мець ніякіх выключэнняў.

СУЦЭЛЬНАЯ ІНФАРМАВАНАСЦЬ

Мэтазгодна карыстацца паслугай SMS-інфармавання (абвесткі) або аналагічнай (напрыклад, з ужываннем push-тэхналогіі або e-mail-паведамлення). Такая паслуга праз SMS забяспечвае аператыўную інфармаванасць аб зробленых па картцы аперацыях і змене астатку па рахунку. Выкарыстанне паслугі SMS-інфармавання дазволіць не толькі неадкладна даведацца пра несанкцыянаваныя вамі аперацыі, але і распачаць необходныя меры для своечасовай блакіроўкі карткі.

У выпадку, калі пры наяўнасці ў вас такой падключанай паслугі паведамленні ад банка аб аперацыях перасталі паступаць на ваш мабільны тэлефон, то неабходна звязацца з банкам для ўдакладнення прычын. Пры атрыманні інфармацыйнага паведамлення аб падазронай аперацыі, якую вы ні рабілі, а таксама калі атрыманае ад банка паведамленне выклікае якія-небудзь сумненні, неабходна заблакіраваць картку любым з даступных спосабаў. Нелішне будзе звярнуцца ў службу кліенцкай падтрымкі банка, які выдаў картку, па тэлефонах, пазначаных на адваротным баку карткі або атрыманых непасрэдна ў банку, і выконваць указанні спецыяліста.

ТОЛЬКІ ПРАВЕРАНЫЯ КАНТАКТЫ

Спецыялісты фінансавай сферы пры любых перамовах прапануюць нам быць больш пільнымі. Для кліента сувязі з банкам, які выдаў картку, неабходна выкарыстоўваць толькі рэквізіты сродкаў сувязі (мабільных і стацыянарных тэлефонаў, факсаў, інтэрнэт-сайтаў, звычайнай і электроннай пошты), атрыманыя з надзейных праверэных крыніц (напрыклад, на старонцы інтэрнэт-банкінгу) або непасрэдна ў гэтым банку.

Пры выяўленні страты (крадзяжу) карткі, пакіданні яе ў банкамаце ці іншай прыладзе самаабслугоўвання, канфіскацыі касірам арганізацыі гандлю (сэрвісу), яе кампраметацыі (калі канфідэнцыйныя даныя карткі сталі вядомыя староннім асобам) альбо пры ўзнікненні падазрэнняў у яе кампраметацыі неабходна неадкладна заблакіраваць картку (патэлефанаваўшы ў службу кліенцкай падтрымкі або з дапамогай сістэм дыстанцыйнага банкаўскага абслугоўвання) і звярнуцца ў банк, які выдаў картку.

Часам уласнікі картак могуць атрымліваць паведамленні з просьбай патэлефанаваць у банк па ўказаных у іх тэлефонах для высвятлення нейкіх нюансаў. У гэтым выпадку спецыялісты не раяць адразу выконваць гэту просьбу, а рэкамендуюць звязацца са службай падтрымкі кліентаў банка па дакладна вядомым вам нумары тэлефона і расказаць аб факце атрымання такога паведамлення.

Таксама будзьце ўважлівымі, калі вы адказваеце на тэлефонныя званкі і паведамленні, якія паступаюць нібыта ад банка. Часам такога работніка банка цікавяць вашы ПІН-код, поўны нумар карткі, тэрмін яе дзеяння ці нешта іншае, што выклікае падазрэнні. Тут лепш спыніць званок і самастойна звязацца са службай падтрымкі банка па дакладна вядомым вам нумары тэлефона.

ЛІМІТЫ ПА МАКСІМАЛЬНАЙ СУМЕ

Пры наяўнасці ў банка, які выдаў картку, магчымасці вызначаць абмежаванні (ліміты) на адначасовае зняцце наяўных грошай і па суме безнаяўных аперацый як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі, пажадана скарыстацца такім сэрвісам. Аднак лепш папярэдне падрабязна азнаёміцца з умовамі прадастаўлення такой паслугі і змянення базавых лімітаў. У гэтым выпадку трэба дакладна разумець, што такія ліміты нават уладальніку карткі хутка змяніць немагчыма.

Асабіста ў мяне быў выпадак, калі мы набывалі ў краме сыну дарагі камп'ютар, а сума здзелкі была большай за вызначаны на картку ліміт. У гэтым выпадку нас выратавала картка жонкі, на якой таксама былі грошы.

А яшчэ спецыялісты Нацбанка прапануюць трымальнікам банкаўскіх картак рэгулярна правяраць стан свайго рахунку (не радзей чым раз на месяц), а таксама пасля замежных паездак, у якіх выкарыстоўваўся віртуальны кашалёк. Пры выяўленні разыходжанняў паміж фактычна зробленымі і адлюстраванымі ў выпісцы аперацыямі звяртацеся ў банк, які выдаў картку, для удакладнення абгрунтаванасці аперацый.

І яшчэ. Пры змене нумара кантактнага тэлефона кліенту неабходна звязацца з банкам для актуалізацыі менавіта такой індывідуальнай інфармацыі. З фінансавай установай сувязь павінна быць двухбаковай, і зацікаўлены ў гэтым не толькі банк.

У наступным матэрыяле рубрыкі «Разумныя грошы» мы раскажам пра нюансы правядзення безнаяўных аперацый у банкаматах, іншых прыладах самаабслугоўвання і ў аддзяленні банка.

Сяргей КУРКАЧ. *kurkach@zviazda.by*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ

ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

18 мая 2016 г.
№ 9 (372)

ЁСЦЬ ПЫТАННЕ

ДОБРА, КАЛІ ЦЯБЕ ЧУЮЦЬ

Карэспандэнт «МС» паспрабаваў разабрацца, што можа паўплываць на актывізацыю дзелавой ініцыятывы

Аляксандр ПУКШАНСКІ

Кожны пяты рубель — ад бізнесу

Летась бюджэт Віцебшчыны дзякуючы бізнес-структурам папоўніўся на 3,8 трыльёна рублёў. Гэта 21,3% усіх фінансавых паступленняў у рэгіён. Кіраўніцтва вобласці, зразумела, зацікаўлена падтрымаць далейшае развіццё бізнесу.

У Прыдзвінскім краі 33 тысячы суб'ектаў малога і сярэдняга прадпрымальніцтва. У гэтым сектары заняты амаль 142 тысячы чалавек. Для параўнання, у аграрным — усяго 48 тысяч. Нягледзячы на эканамічныя праблемы, бізнес адчувае сабе ўпэўнена. У цэлым працуе нават з плюсам.

— І гэта пры тым, што пакупніцкая здольнасць насельніцтва памяншаецца, існуюць іншыя пытанні. Летась уклад прадпрымальніцтва ў бюджэт узрос на 4,5%, — паведамляе **Аляксандр ТРАФІМАЎ, начальнік упраўлення развіцця прадпрымальніцтва камітэта эканомікі Віцебскага аблвыканкама.**

Чым жа займаюцца дзелавыя людзі? Чвэрць бізнесу — у гандлі, 20% — у прамысловасці, 13% — у будаўніцтве, 8% аказваюць транспартныя паслугі і паслугі сувязі, 7% — у сельскай гаспадарцы...

Кавярня — гэта не офіс!

Якую дапамогу чакаюць прадпрымальнікі ад улады? Што ўвогуле іх турбуе? Аказалася, што ў першую чаргу некаторых дзелавых людзей хвалюе неразуменне.

— Прадпрыемству харчавання, якім кірую, 23 гады. За электраэнергію плацім, як офісы. Нонсэнс! Зразумела, што ў кавярні шмат энергаёмістага абсталявання. І выдаткі абавязкова закладзены ў цану страў... Паспрабавала «пралабіраваць», каб аплачваць за электраэнергію, як прамысловыя прадпрыемствы. Але з трох міністэрстваў — гандлю, эканомікі і энергетыкі — своечасова адказы не атрымала, — распавядае **ўладальніца віцебскага рэстарана «Лямус» Ларыса ПЕТРУШЭНКА.**

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Дзмітрый Банны і Вадзім Палякоў прысвяцілі роднаму куточку музычны нумар.

ГЭТА МАГЧЫМА

ЗРАБІЛІ САБЕ СВЯТА

Без грошай цяжка стварыць нешта істотнае, але для захопленых ідэяй людзей няма нічога нерэальнага

Пра старасту вёскі Смолькі Касцюковіцкага раёна Аляксандра Абраменку, які разам з жонкай Аленай імкнецца захаваць гісторыю сваёй маленькай радзімы і не даць ёй знікнуць, мы ўжо пісалі. Зараз нагодай іх успомніць стала свята вёскі Смолькі. Сужэнцы цалкам узялі на сябе яго арганізацыю, нават напісалі Палажэнне і стварылі аргкамітэт. Па сакрэце прызналіся: падрыхтоўка заняла столькі часу, што давялося зацягнуць з пасяўной. Але не шкадуюць ні кроплі. Як-ніяк, іх населенаму пункту «стукнула» 340 гадоў!

Аляксандр і яго жонка без працы не сядзяць, — вялікая гаспадарка не дазваляе. Але час на грамадскія справы заўсёды знаходзяць. Як людзі неабыякавыя, упэўнены: пакуль ураджэнцы вёскі трымаюць сувязь адзін з адным і клапоцяцца пра свой супольны дом, ніякія нягоды ім не страшныя. На запрашэнне прыняць удзел у агульным святе адгукнуліся землякі з усіх куточкаў Беларусі і нават з Латвіі. Госці з Рыгі прывезлі з Касцюковіч і свайго паважанага продка — ветэрана вайны Мікалая Напрэнку, таксама ўраджэнца Смолек.

Вёску дзякуючы намаганням старасты было не пазнаць. Перш за ўсё ён арганізаваў уборку вуліц, з дапамогай Ігара Волкава і Віктара Праявіна абрэзаў сучча, кустоўе, скасіў траву. На правах старасты заклікаў жыхароў прыбраць каля сваіх дваро смецце. Асабіста ўпрыгожыў цэнтральную вуліцу сцяжкамі, якія разам з жонкай выразаў напярэдадні. Старшыня Сялецкага сельскага Савета Сяргей Прахарэнка работу ацаніў. Сказаў, што вёска зараз можа смела ўдзельнічаць у конкурсе на званне найлепшай і нават спадзявацца на прызавое месца.

Зараз у Смольках нават прырода спявае.

Галоўныя падзеі свята адбываліся на гістарычным месцы, дзе, па словах старажылаў, у чэрвені 1941-га жыхарам аб'явілі, што пачалася вайна.

— Калісьці тут стаяла кузня, гудзеў шынок, а на ўзгорку круціў свае драўляныя крылы ветраны млын, — удакладняе Аляксандр, які перавярнуў увесь інтэрнэт у пошуках карыснай інфармацыі пра вёску і цяпер ведае пра яе ўсё. На свяце ён прыгадаў, што адбывалася на тутэйшых землях у XVII стагоддзі, як на становішча яе жыхароў паўплывалі Паўночная вайна і вайна з Напалеонам. Калі расказваў пра паслярэвалюцыйныя падзеі і рэпрэсаваных, некаторыя нават плакалі. Тэма балючая. Летась старасту перадаў у райвыканкам і ваенкамат знойдзеныя ім звесткі аб 26 раней нідзе не згаданых ураджэнцах вёскі, якія бралі ўдзел у Вялікай Айчыннай вайне.

Для аднавяскоўцаў Аляксандр і Алена Абраменкі падрыхтавалі цудоўны канцэрт. Ідэю падтрымалі іх шматлікія сябры і былыя вучні Аляксандра, у мінулым настаўніка фізкультуры. Дзмітрый Банны і Вадзім Палякоў, якія самі ўжо настаўнікі, а па сумяшчальніцтве салісты вакальнай групы «Звязда», прысвяцілі роднаму куточку музычны нумар. Ларыса Шчарбакова, якая дапамагала рассылаць запрашэнні на свята, на імправізаванай сцэне дэкламавала вершы. Настаўніца па адукацыі Лізавета Кавалёва, якая цяпер працуе ў дзіцячым садку ў Касцюковічах, праспявала песню. Фізрук Баронькаўскай школы Анастасія Палякова разам з Аленай Абраменкай зрабілі сцэнку ў стылі «новых рускіх бабулек». Настрой землякам падымала таксама Наталля Старасвецкая-Волкава, якая выйшла на сцэну разам са сваімі дочкамі Алесяй, Вікай і Насцяй.

Не менш уражанняў пакінулі фотавыстава і выстава ручнікоў, экспанаты для якой мясцовыя жыхары дасталі са сваіх куфраў. Успамінаў засталося столькі, што хопіць да наступнага года. А потым няўрымслівыя Аляксандр і Алена Абраменкі нешта зноў прыдумаюць...

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

Гуляй, родная вёска.

У СВАЁЙ АКРУЗЕ

НАЙЛЕПШАЯ ДАПАМОГА — АДРАСНАЯ

Гродна — адзін з самых прыгожых і прывабных для турыстаў гарадоў нашай краіны. Але для Тамары ДАЎГАШЭЙ, галоўнага ўрача Гродзенскага абласнога клінічнага кардыялагічнага цэнтра, намесніка старшыні Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па адукацыі, навуцы, культуры і сацыяльным развіцці (вылучана ад г. Гродна), гэты горад — аб'ект не столькі для захаплення, колькі для паляпшэння жыцця людзей. Пра тое, як працуецца з грамадзянамі, з якімі праблемамі даводзіцца сутыкацца і як яны вырашаюцца, спецыяльна для «МС» расказала парламентарый.

АСАБЛІВАСЦІ ТЭРЫТОРЫІ

Сёння Гродна — горад шматканфесійны. У ім знаходзіцца адзіная ў Беларусі лютэранская кірха, у якой дзейнічае прыход у 40 чалавек. У лютэранскім храме таксама існуе цэнтр культуры, дзе часта арганізоўваюцца канцэрты на аргане, які прывезлі калісьці з Германіі. Ёсць сінагога з музеем генацыду яўрэяў. Ёсць і каталіцкая супольнасць, і праваслаўная. Усе жывуць у згодзе, лічыць Тамара Даўгашэй, бо зваротаў да яе ад святароў практычна не бывае.

Большасць насельніцтва горада — жанчыны. Так было заўжды. Справа ў тым, што ў Гродне размешчана шмат жаночых вытворчасцяў: тэкстыльнае прадпрыемства «Гронітэкс», на якім вырабляюць пражу і ніткі; Conte — вядомая на ўсю краіну вытворчасць калготак, панчох і шкарпэтак, кампанія «Малочны свет». Ёсць і традыцыйна мужчынскія — «Гродна Азот», «Гродзенская тытунёвая фабрыка «Нёман», мясакамбінат.

«Сацыяльна-дэмаграфічная структура такая, што ўсё ж такі прэваліруе жаночае насельніцтва. Таму ходзяць на прыём у асноўным жанчыны; як правіла, пытанні іх цікавяць бытавыя: школа для дзяцей, садзік — каб быў побач з домам, уладкаванне на працу. Часцей за ўсё наведвальніцы працуюць у сістэме адукацыі: настаўніцы ці выхавальніцы. Прытым 80% пытанняў носяць характар сацыяльна-бытавы, камунальны, яны тычацца рамонту ў пад'ездзе, уладкавання дваровых тэрыторый, адукацыі і медыцыны», — расказвае сенатар.

Па словах Тамары Даўгашэй, людзі прыходзяць на прыёмы з рознымі праблемамі. Часам — каб даказаць, што маюць рацыю, нават калі гэта не так. Шмат хто з іх хоча проста пагутарыць. На думку Тамары Сяргееўны, беларусам не хапае размоў і зносін, таму такая вялікая колькасць зваротаў і скаргаў да ўладаў. Часта гэты недахоп спатольваецца ў чэргах у паліклініцы, калі людзі гадзінамі абмяркоўваюць найлепшыя спосабы ратавання ад хвароб. «Я думаю, што варта развіваць сацыяльную сферу, ствараць месцы, у якіх блізкія па інтарэсах людзі змогуць часцей сустракацца, бавіць час, і асабліва — пажылыя, адзінокія. Ім не так шмат трэба: цёплае памяшканне, стол, крэслы і добрая кампанія», — упэўнена яна.

ПАВЫШЭННЕ ПЕНСІЙНАГА ЎЗРОСТУ

— Я сама хаджу на прадпрыемствы, калі змяняецца пэўнае заканадаўства, — распавядае Тамара Даўгашэй. — Раней гэта былі падаткі на дарогі, а апошняе, самае актуальнае, — пытанне пенсійнага забеспячэння і павышэння пенсійнага ўзросту. Цяпер толькі лянівы не задае пытанні пра гэта. На маю думку, такая мера досыць своечасовая. Бо інакш у нас хутка на 10 працоўных будзе 15 пенсіянераў. Працягласць жыцця павялічваецца, а колькасць тых, хто працуе, большай не становіцца. Трэба разумець, што сёння 85% жанчын пасля 55 гадоў выходзяць на пенсію, але працягваюць працаваць. Я, як доктар, магу сказаць, што жанчыны здаравейшыя за мужчын. Для жанчыны інфаркт у 45 гадоў — нонсенс, для мужчыны, на жаль, — звычайная справа. Прыродай так створана, што пакуль жанчына здольная нараджаць дзяцей, яна не можа хварэць на штосьці сур'ёзнае і смяротнае. А ўжо пасля 60-65 гадоў рызыкі абодвух палоў становяцца роўнымі. Для параўнання, у Літве ў жанчын пенсійны ўзрост — 67 гадоў, у Германіі ў жанчын — 68 і ў мужчын — 72. Для Беларусі пенсійны ўзрост у 55 і 60 гадоў быў бы непамернай нагрузкай на бюджэт.

Галоўны ўрач таксама лічыць, што дэкрэтны адпачынак працягласцю ў 3 гады — занадта вялікая раскоша. «Медык, калі столькі гадоў быў без практыкі, мусіць ледзь не наноў вучыцца. Бо навыкі і веды за тры гады цалкам губляюцца», — кажа сенатар. Па яе словах, у некаторых краінах дэкрэтнага адпачынку ці зусім няма, ці ён значна менш за беларускі. Напрыклад, у Іспаніі гэта — 16 тыдняў, ЗША — 12 (і ён не аплачваецца). «Па сваім вопыце магу сказаць, што ў 2 гады дзіця больш ці менш свядомае, здольнае самастойна адзявацца. Можна аддаваць у садок», — лічыць парламентарый.

ПА РУХАХ РАЗУМЕЕШ ЧАЛАВЕКА

«Часам звяртаюцца да мяне і як да доктара, — расказвае сенатар. — На прадстаўнічых дабрачынных мерапрыемствах часта даводзіцца бачыць хворых дзетак. Тады па магчымасці стараемся і ім дапамагчы: транспартнымі сродкамі, медыкаментамі, адзеннем. Нядаўна аднаму хлопчыку, які вучыцца на даму, дапамаглі з каляскай. Аўстрыйскі Чырвоны Крыж ахвяраваў лёгкую і зручную, каб падлетак сам змог перасоўвацца. Памятаю, аднойчы на прыём прыйшла жанчына, хвораму дзіцяці якой споўнілася 18 гадоў, ільготаў стала менш, але ён жа не стаў раптоўна здаровым. Маці звярнулася да нас, бо на самае неабходнае перастала хапаць грошай. Прасіла спакойна і нават сарамліва. Мы дапамагаем кожнаму, як можам, але ў такіх выпадках хочацца яшчэ больш зрабіць», — прыводзіць прыклады з практыкі Тамара Сяргееўна. Яна ўвогуле лічыць, што найлепшая дапамога — адрасная. Чым набываць чарговы тэлевізар у дзіцячы дом, лепей для маці з хворым дзіцем, якой не хапае на жыццё, сабраць пэўную суму і аддаць.

Апошнім часам зваротаў і скаргаў да ўладаў стала паступаць больш. Тамара Даўгашэй лічыць, што гэта звязана не толькі з жыццёвымі абставінамі, але і са зменамі ў светапоглядзе людзей. «Як бы дзіўна гэта ні прагучала, але раней людзі ставіліся да праблем са здароўем з пакорлівасцю, прымалі іх як непазбежную частку рэчаіснасці... Сёння з чалавекам яшчэ нічога на здарылася, але ён ужо абышоў усе інстанцыі і абвінаваціў сістэму аховы здароўя. Ментальнасць мяняецца», — дзеліцца развагамі галоўны ўрач.

Па словах сенатара, у працы з грамадзянамі дапамагае і яе прафесія. «Па тым, як чалавек рухаецца, як гаворыць, як цябе слухае, па выразе яго твару шмат што можна сказаць. Псіхалогія адыгрывае значную ролю. Напрыклад, у размове стараюся не ўжываць часціцу «не», бо яна горш успрымаецца. Лепей сказаць: «Безумоўна, ваша праблема актуальная, але давайце падумаем...», — дзеліцца «сакрэтамі» Тамара Даўгашэй. — У функцыю доктара не ўваходзіць перавыхоўваць людзей, наша задача — вылечыць іх незалежна ад складу асобы і твайго стаўлення. Таму на прыёмах я стараюся дапамагчы кожнаму».

Вераніка ПУСТАВІТ.
pustavit@zviazda.by

АЛЕЯ Ў ГОНАР СЯРЖАНТА

з'явілася непадалёк ад пахаванай вёскі Кульшычы ў Слаўгарадскім раёне

У жніўні 1994 года тут загінуў 22-гадовы **Мікалай КРАСНАЎЦАЎ, міліцыянер узвода па ахове тэрыторый радыеактыўнага забруджвання Слаўгарадскага РАУС.** Падчас агляду мясцовасці яны разам з таварышам па службе ўбачылі тут пажар і кінуўся тушыць. З-за моцнага ветру была пагроза, што полымя перакінецца на сухую раслінасць і дрэвы. І тады б памеры няшчасця маглі быць непрадказальнымі. Хто тады ведаў, што ў пажоўклай траве ляжыць смяротны электрычны провад пад напружаннем і гэта будзе каштаваць сяржанту жыцця?

Цяпер аб тых трагічных падзеях нагадвае памятны знак з мемарыяльнай дошкай, які ўсталяваны на месцы гібелі міліцыянера. А сёлета, у год 30-й гадавіны з дня аварыі на Чарнобыльскай АЭС, закладзена сімвалічная алея памяці ў гонар гэтага чалавека. Маладыя супрацоўнікі Слаўгарадскага РАУС, ветэраны аддзела, навучэнцы 10-га класа падшэфнай школы пасадзілі тут 60 дрэўцаў лістоўніцы. Успамінаючы пра падзеі больш чым 20-гадовай даўніны, **начальнік Слаўгарадскага РАУС падпалкоўнік міліцыі Юрый ДЗЕНІСЕВІЧ** падкрэсліў, што чарнобыльская трагедыя, у ліквідацыі наступстваў якой мужна прымалі ўдзел і слаўгарадскія міліцыянеры, у жніўні 94-га атрымала балючы працяг. Доўг супрацоўніка міліцыі думаць у першую чаргу пра тых, на абароне чыіх інтарэсаў ён знаходзіцца.

Нэлі ЗІГУЛЯ. *zigulya@zviazda.by*

ВЫПРАБАВАНА НА САБЕ

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

ПАЧАЛОСЯ... З СОРАМУ

Як мы адрамантавалі пад'езд у сваім шматпавярховіку

Барыс ПРАКОПЧЫК

Аўтар гэтых радкоў — адзін з жыльцоў гродзенскага шматпавярховіка 25-гадовага «ўзросту» з тыповымі для многіх дамоў далёка не першай маладосці праблемамі. Сярод іх — убогі выгляд сцен і століяў у пад'ездзе, якія даўно альбо нават з моманту пабудовы не бачылі рамонту. І няўжо не ўбачаць? Мы з суседзямі не паддаліся абыякавасці, безнадзейнасці і ўсё ж здолелі прывесці ў парадак месцы агульнага карыстання ў нашым пад'ездзе. Вось як гэта ў нас атрымалася.

Асабіста для мяне жаданне адрамантаваць пад'езд пачалося з... пачуцця сораму. Перад людзьмі, што прыходзяць да цябе ў госці і бачаць на сцяне першага паверха даўнія «аўтографы» з серыі «тут быў ...» ці «пра кагосьці», прычым і з выкарыстаннем ненарматыўнай лексікі. Перад работнікамі камунальнай службы, якія, ведаючы сітуацыю ў іншых дамах, сказалі, што наш пад'езд у ліку найгоршых у мікраёне. Ды і перад самім сабой: хіба ж нармальна штодня ўзірацца на гэтую абшарпанасць, неахайнасць, адзнакі хамства і не паварушыць пальцам, каб зрабіць хаця б самае элементарнае і не надта складанае (афарбоўка сцен і століяў) у параўнанні з іншымі работамі па рамонце жылля?

Ведаючы, што ў гэтым жаданні са мной салідарныя і некаторыя з суседзяў (за ўсіх сказаць немагчыма), вырашыў дзейнічаць. На першым этапе неабходна было правесці сход жыльцоў, каб зразумець, ці настроены яны на рамонтныя работы, якія трэба будзе выканаць за свой кошт? Раней, як вядома, існавала практыка долевага ўдзелу жыльцоў у рамонце месцаў сумеснага домаўладання. Паступова можна было прызвычаіцца, што аб парадку ў пад'ездзе трэба клапаціцца і ўласнымі грашыма. Аднак у нашым шматпавярховіку жаданне пасуправацоўнічаць у гэтым кірунку з жыллёва-камунальнай службай праяўлена не было. І наколькі ж рэальна адрамантаваць пад'езд цяпер — ужо не на долевых умовах, а выключна за свой кошт? Як паставяцца да гэтага іншыя жыльцы дома? Ці не атрымаецца, што для большасці гэта зусім не важна?

> Наколькі ж рэальна адрамантаваць пад'езд цяпер — ужо не на долевых умовах, а выключна за свой кошт? Як паставяцца да гэтага іншыя жыльцы дома?

З такімі думкамі, не надта і верачы ў поспех справы, я звярнуўся да начальніка ЖЭС-2 Людмілы Саўко з просьбай арганізаваць сход жыльцоў і патлумачыць умовы правядзення рамонту ў пад'ездзе. Ініцыятыву падтрымалі, і неўзабаве такі сход адбыўся. Першапачатковая асцярога, што ідэя адрамантаваць пад'езд за ўласныя грошы спадабаецца не ўсім, сапраўды пацвердзілася. Некаторыя сустрэлі яе ў штыкі: маўляў, столькі гадоў плацім за капітальны рамонт, практычна нічога не рабілася, і раптам трэба раскашэльвацца самім?

Сапраўды, у «жыроўках» ёсць артыкул «адлічэнні на капрамонт». Але пры гэтым рэаліі такія, што «адраснага» накаплення (асобна па кожным жылым доме) не адбываецца. І зусім не факт, што гэтых штомесячных плацяжоў (яны ўведзены ў Беларусі з 1999 года) хапіла б, напрыклад, на цеплавую рэабілітацыю фасадаў, якую зрабілі ў нашым доме некалькі гадоў таму. Што ж тычыцца бягучага рамонту жыллёвага фонду, то, паводле пастановы Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі ад 4 чэрвеня 2014 г. № 12, вызначана, якія віды работ фінансуюцца за кошт бюджэту, а што — уласнікамі, наймальнікамі жылых памяшканняў. У нашым выпадку (заштукоўванне выбоін, трэшчын, афарбоўка сцен, століяў у пад'ездзе) ажыццяўляецца выключна за сродкі жыльцоў.

Наступны сход адбыўся ўжо пасля таго, як работнікі ЖЭСа зрабілі абмер, вызначылі аб'ёмы работ і сумесна з УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна склалі каштарыс. Паколькі прапаноў рамантаваць сваімі сіламі альбо з дапамогай нейкіх спецыялістаў ад жыльцоў нашага пад'езда не паступіла, а аб'ём работ для брыгады пры ЖЭСе быў даволі вялікі, падрадчыкам стаў «Гроднажылбуд».

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

У тэму

Пацікавіўся ў начальніка ЖЭС-2 г. Гродна Людмілы Саўко, ці няма праблем з платай за зроблены ў нашым пад'ездзе бягучы рамонт. Не, людзі разлічваюцца нармальна, чаму, пэўна, спрыяе і растэрміноўка плацяжоў ажно на паўгода.

На думку начальніка аддзела эксплуатацыі жыллёвага фонду УЖРЭП Ленінскага раёна г. Гродна Ірыны Царанковай, паступова людзі ўсё больш разумеюць, што аб парадку ў сумесных домаўладаннях трэба клапаціцца ў разліку не толькі на бюджэтныя, але і ўласныя сродкі. Летась на тэрыторыі, якая абслугоўваецца гэтым прадпрыемствам, адрамантавалі 348 пад'ездаў, сёлета — 58, а па плане на год — 218. Пры гэтым часцей жыльцы робяць рамонт самастойна, а хтосьці, як у нашым пад'ездзе, у партнёрстве з жыллёва-камунальнай службай.

ДОБРА, КАЛІ ЦЯБЕ ЧУЮЦЬ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

Не атрымаўшы і праз 3 месяцы адказаў, нагадала чыноўнікам пра адпаведнае заканадаўства аб зваротах грамадзян і юрыдычных асоб.

Яшчэ адна дзелавая жанчына пытаецца: чаму ў саюзнай Расіі для пачаткоўцаў умовы прывабнейшыя, чым у нас?

— У прыватнасці, на пачатку дзейнасці там не патрабуюцца абавязковыя пералічэнні ў Фонд сацыяльнай абароны насельніцтва... Мы ж у інтэграцыі з Расіяй, дык, можа, трэба неяк прывесці ўсё да аднолькавых умоў? — разважае яна.

А кіраўніка фірмы па аказанні рытуальных паслуг хвалюе канкурэнцыя. Маўляў, абяцанні нізкіх цэн на паслугі часта — сінонім нізкай якасці гэтых паслуг або проста падману... Куды глядзяць праваахоўнікі?

Прасцей перакласці адказнасць?

Нядаўна ў Віцебску адбыўся сход грамадскага аб'яднання «Асацыяцыя наймальнікаў і прадпрымальнікаў». У ім больш за 180 членаў з розных гарадоў і раёнаў.

— Толькі летась дзяржава атрымала ад іх больш за 74,5 мільярда рублёў падаткаў, — падкрэсліла **Ніна ЛУК'ЯНАВА, выканаўчы дырэктар аб'яднання.**

Дзелавыя людзі агучылі прэтэнзіі ў адрас адказных за бізнес ва ўладзе. У прыватнасці, у аблвыканкам да іх цяжка трапіць на сустрэчу. Яшчэ неабходна прывесці да разумных суадносін пакаранні за тыя ці іншыя парушэнні. Мясцовая ўлада ў адказ на прапановы нешта змяніць спасылаецца на рэспубліканскі ўзровень. Маўляў, там усё вырашаюць. Навошта тады існуе савет па падтрымцы прадпрымальніцтва пры аблвыканкаме? А менавіта ж на пасяджэннях пад эгідай савета можна канкрэтна абмеркаваць праблемы. Як і паспрабаваць разам выпрацаваць шляхі пераадольвання... Пры гэтым ад «ініцыятыўных людзей» чакаюць яшчэ большай ініцыятывы і стварэння новых працоўных месцаў.

Кіраўнікі мясцовай выканаўчай улады перыядычна падкрэсліваюць, што гатовы да дыялогу з бізнесам. Магчыма, проста трэба наладзіць нармальны механізм узаемадзеяння?

Тым не менш, ахвотных распачаць сваю справу хапае. Для іх дзейнічаюць цэнтры падтрымкі. Вельмі плённа працуе віцебскі інкубатар малога бізнесу. Там кансультуюць не толькі пачаткоўцаў. На біржы працы асобныя «прэферэнцыі» для тых, хто вырашыў пачаць працаваць на сябе. І ўжо нямала прыкладаў паспяховай бізнес-дзейнасці экс-беспрацоўных...

pukshanski@zviazda.by

Намеснік старшыні Віцебскага аблвыканкама Алег МАЦКЕВІЧ на V Міжнародным эканамічным форуме «Інавацыі. Інвестыцыі. Перспектывы», які адбыўся нядаўна, прывёў прыклады ўдалага дзяржаўна-прыватнага партнёрства. Паводле яго слоў, у Беларусі шмат законаў, якія спрыяюць развіццю прадпрымальніцтва. Але ёсць факты, калі нюансы не дазваляюць рэалізаваць нейкія праекты, або прадпрымальнікі сутыкаюцца з валакітай на месцах, у раёнах. У такім выпадку яны могуць знайсці разуменне на ўзроўні абласной вертыкалі ўлады, якая, дарэчы, падтрымлівае бізнес не толькі на словах. За тры гады з 200 мільярдаў інавацыйнага фонду аблвыканкама 40 мільярдаў прадстаўлены малому бізнесу. І гэта не крэдыт, а беззваротная фінансавая падтрымка...

Вясковая, участковая...

Пад напорам грамады бальніцу пакінулі і нават адкрылі тут новае аддзяленне

Чарнаўчыцкая ўчастковая бальніца, што ў Брэсцкім раёне, больш за дзясятак гадоў таму ледзь не трапіла пад рэарганізацыю. Яе намерваліся зрабіць бальніцай сястрынскага догляду для цэлага раёна. А гэта азначала б закрыццё сельскай лячэбнай установы як стацыянара для абслугоўвання насельніцтва. На сходы прыязджалі прадстаўнікі і ўпаўнаважаныя, людзям даводзілі, як добра ім будзе жыць без бальніцы. Але жыхары сельсавета катэгарычна выказаліся супраць. Актыўнасць праявілі старасты вёсак і кіраўніцтва сельвыканкама. Адным словам, пад напорам грамады бальніцу ў Чарнаўчыцах пакінулі. Тут, праўда, знайшлося месца і аддзяленню сястрынскага догляду, такія ж сацыяльныя ложкі адкрылі і ў іншых участковых бальніцах раёна.

Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Лілія ПРЭДКА, загадчыца бальніцы.

Патрэбная вяскоўцам

Пра старонку з недалёкай гісторыі сваёй бальніцы аўтару гэтых радкоў расказалі сталыя пацыенткі, што праходзяць зараз курс лячэння. Любоў Шчур з Чарнаўчыц, Ганна Міззрыя з вёскі Покры прымаюць уколы і кропельніцы. Кацярына Піваварчук праходзіць чарговую рэабілітацыю пасля перанесенага інфаркту. Жанчыны вельмі ўдзячныя медыкам за чулыя адносіны, увагу. Згадалі кухараў, якія смачна гатуюць. А пра доктара свайго Лілію Віктараўну сказалі, што дзякуючы ёй яшчэ жывуць на гэтым свеце, могуць займацца хатнімі справамі і не сталі абузай для сваіх родных. Як аказалася, усе жанчыны маюць сардэчныя праблемы і праходзяць курс у сваёй лячэбнай установе рэгулярна.

> “ У кожнага з гэтых людзей свая гісторыя, правільней сказаць, свая драма...

Лілія Прэдка — загадчыца бальніцы, па сутнасці яе галоўны ўрач. Можа, цяперашняя назва пасады кіраўнікоў сельскіх установ і больш правільная. Не галоўурач, а менавіта загадчык, якому трэба займацца рамонтам будынка, набыццём і абслугоўваннем абсталявання, а таксама кашэннем травы на тэрыторыі ў тры гектары. Як, напрыклад, у Чарнаўчыцах. Не перавялі ў свой час гэты ўчастак у муніцыпальную ўласнасць. А цяпер ёсць адпаведныя службы, якія ўважліва сочаць, каб трава на тэрыторыі была своечасова і чыста прыбраная. Гэта ўсяго толькі адзін штрышок да аповеду пра сельскую ўчастковую бальніцу. Такія ж рабочыя пытанні вырашае, напэўна, кожная з падобных установ краіны.

Спецыфічнае аддзяленне

Штодзённая работа калектыву з 38 чалавек заключаецца ў клопаце пра здароўе людзей. Лілія Віктараўна вельмі ганарыцца сваім калектывам. Кажа, што людзі падабраліся такія, што кожны з іх на сваім месцы. Асабліва няпроста было першыя гады са спецыфічным аддзяленнем сястрынскага догляду. Не ўсе сёстры, санітаркі былі гатовыя да працы з цяжкімі пацыентамі. Таму некаторыя не вытрымалі, пастараліся знайсці работу ў іншым месцы. З ліку сярэдняга і малодшага персаналу засталіся тыя, хто можа даглядаць ляжачых хворых.

Лілія Прэдка запрасіла зазірнуць у палату сваіх пастаянных «насельнікаў». І чыста там, і ўсе яны дагледжаныя, а ўражанне цяжкае...

У кожнага з гэтых людзей свая гісторыя, правільней сказаць, свая драма. Бо дажываць адпушчаныя лёсам дні на сацыяльным ложку — ні для каго не пажаданы фінал жыцця. Ёсць тут, напрыклад, 90-гадовая адзінокая бабулька, былы медыцынскі работнік. Паводле слоў медыкаў, яна цяпер часта наракае на сваю неабачлівасць і неразумнасць, бо ў маладосці прысвяціла сябе цалкам рабоце, не нарадзіла дзяцей.

— Але і дзеці не гарантыя, што не трапіш у бальніцу сястрынскага догляду. Яе суседкі па палаце маюць нашчадкаў, — гаворыць Лілія Прэдка. — Адна з іх шкадуе, што ў яе толькі сыны, няма дачкі, другая апраўдвае дачку, бо тая жыве далёка. Гледзячы на іх, філосафам станаўлюся, — разважае далей доктар. — Нічога няма ў гэтым свеце звышнадзейнага, і ніхто не застрахаваны ад бяды. Гэта па-першае. А па-другое, за лад жыцця, за прывычкі маладосці вельмі часта даводзіцца расплачвацца ў старасці. Днямі паступіў пацыент, зусім не стары, каля 60-і гадоў. Усё жыццё злоўжываў спіртным, ні сям'і, ні радні. Цяпер вось застаўся без нагі і трапіў у аддзяленне сястрынскага догляду. Адным словам, геранталогія — складаная і шматгранная частка медыцыны.

Самы вялікі ўчастак

Асноўная ж работа бальніцы, у склад якой уваходзіць амбулаторыя, заключаецца ў абслугоўванні насельніцтва ўчастка. Гэта, дарэчы, самы вялікі ўчастак у Брэсцкім раёне. У яго склад уваходзіць 19 вёсак, 5 тысяч насельніцтва. Радыус зоны абслугоўвання дасягае 20 кіламетраў. У амбулаторыі штодзень пацыентаў прымаюць урач-тэрапеўт і педыятр. У штаце ёсць таксама стаматолаг, акушэрка, працуе свая лабараторыя, ажыццяўляюцца фізіяпрацэдуры.

Зранку 13 мая на прыём да абодвух урачоў была даволі вялікая чарга. Сядзелі і дарослыя пацыенты, і мамы з дзецьмі. У зону ўчастка ўваходзяць дзве сярэднія школы, два дзіцячыя садкі. Урач бывае на прафілактычных аглядах, выязджае па выкліках і вядзе прыём у амбулаторыі. На ўчастку ў педыятра Вольгі Павярынавай запісана 1182 дзіцяці, з іх 70 немаўлятак ва ўзросце да года. Паводле слоў медсястры Таццяны Пякарскай, штодзень на прыёме бывае 35-40 пацыентаў. Як бачым, нагрузка немалая. А яшчэ варта дабавіць прафілактычную работу, што вядзе доктар. Напрыклад, наведвае дзяцей у сем'ях, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы. Цяпер на ўчастку такіх сем'яў пяць, там выхоўваецца восем дзяцей. Як заўважае Вольга Фёдараўна, усе бацькі правільна разумеюць сітуацыю, ёсць спадзяванне, што паступова іх будуць выключаць з названых спісаў.

На прыёме ў педыятра Вольгі ПАВЯРЫНАВАЙ.

Лабарант Марына Панюціч у сваім кабінеце праводзіла аналізы з тых узораў біялагічнага матэрыялу, які яна брала зранку. У гэтую змену ў яе было 20 агульных аналізаў крыві, 12 проб — на ўтрыманне цукру ў крыві і некаторыя іншыя. Старшая медсястра Людміла Юпатава, як заўсёды, удакладняла графікі, звярала прэпараты, інструмент, шчыравала з дакументацыяй. Людміла Якаўлеўна вельмі вопытны медработнік, яна сваю бальніцу ведае лепш за іншых, кіраўнік жартам параўнала яе з начальнікам штаба на армейскі манер.

Пасля кароткага наведвання амбулаторыі загадчыца бальніцы Лілія Прэдка спяшалася на абход у стацыянар. Трэба было паглядзець новага пацыента. Ім аказаўся Віктар Х., яшчэ зусім малады чалавек. У ходзе прафілактычнага агляду ў яго выявілі язву страўніка, якую хворы пакуль ніяк не адчуваў. Своечасова праведзенае лячэнне стане гарантыяй нармальнай якасці жыцця і працаздольнасці маладога мужчыны, гаворыць доктар. Яшчэ Лілія Віктараўна заўважыла, што жыхары суседніх краін часам нават здзіўляюцца, што ў нас ёсць такая форма работы з пацыентамі, як прафілактычны агляд. Не ўсе могуць пахваліцца гэтым.

Адзнакі работы

Чарнаўчыцкая ўчастковая бальніца была ўзведзеная больш за 50 гадоў таму. Гэты будынак не выглядае як суперсучасная медыцынская ўстанова, не ўсім крытэрыям, што прад'яўляюцца да бальніцы ў XXI стагоддзі, адпавядае. Але яго своечасова рамантуюць, падтрымліваюць у належным стане, за што загадчыца ўдзячная мясцоваму СВК, сельскаму Савету. І бальніца паспяхова спраўляецца са сваёй асноўнай функцыяй. Аб тым, як спраўляецца, сведчаць некаторыя адзнакі.

Названая ўстанова адносіцца да Брэсцкай гарадской бальніцы №2. Яе галоўны ўрач Яўген Капылец сказаў, што па выніках мінулага года ў рэспубліканскім аглядзе якасці і культуры абслугоўвання насельніцтва Чарнаўчыцкая ўчастковая бальніца стала другой ў краіне і першай па вобласці сярод устаноў падобнага тыпу. Паводле слоў Яўгена Мікалаевіча, гэта найперш паказчык сістэмы работы, якая складвалася гадамі, і заслуга даволі прафесійнага калектыву.

Святлана ЯСКЕВІЧ.

yackevich@zviazda.by

Брэсцкі раён.

УСЁ Ў ПАРАДКУ?

БУДЗЕМ МІЛАСЭРНЫМІ,

або Хто дагледзіць месца апошняга прытулку?

Вёска, дзе я нарадзілася, раздзялілася на два «лагеры»... А пачалося ўсё з ініцыятывы старасты Галіны — расчысціць могілкі ад старых трухлявых бяроз, якія ў любы час маглі паваліцца на помнікі, стваралі небяспеку для людзей. Здавалася б, па 300 тыс. рублёў з кожнага падворка — не такія вялікія грошы. Але ж некаторых жыхароў, як кажуць, задушыла жаба: чаму, маўляў, я павінен аддаваць грошы? Няхай калгас або сельвыканкам за свае сродкі наводзіць парадак. Староста намагалася давесці нязгодным, што на выдаленне адной бярозы неабходна каля мільёна рублёў, а трэба ж спілаваць дзясяткі дрэў. У сельвыканкама няма такіх сродкаў. Ды і наогул на яго тэрыторыі не адны грамадзянскія могілкі. Але яе словы адскоквалі ад людзей, нібы гарох ад сцяны.

Словам, давялі бедную Галіну да слёз. «Якім чэрствым трэба быць, каб так ставіцца да памяці сваіх продкаў, родных, блізкіх, якія знайшлі тут спакой, — скардзілася мне жанчына. — Абы спіхнуць свае абавязкі на сельсавет, чужога дзядзьку».

Гэты выпадак я прыгадала ў размове са **старшынёй Салігорскага раённага Савета дэпутатаў Лідзіяй КЛІШЭВІЧ.**

— А ці даводзіцца вам, Лідзія Анатолеўна, сустракацца з такой сітуацыяй? — пацікавілася ў яе.

— Бясспрэчна, хочацца, каб работа па навядзенні парадку, у тым ліку і на могілках, была не толькі абавязкам выканаўчай і прадстаўнічай уладаў, а і саміх грамадзян. На долевы ўдзел па ўладкаванні могілак нашы людзі, як правіла, адгукаюцца. Але, на жаль, ёсць і тыя, хто адмаўляецца, маўляў, мы плацім падаткі дзяржаве, няхай яна і займаецца гэтым, — адзначае яна. — Радуе, што могілкі ў маёй роднай вёсцы Дубеі былі агароджаны аднымі з першых. Менавіта мае землякі сабралі на гэта грошы. А летась на суботнік, што тут праводзіўся, выйшлі 58 чалавек. Спачатку — людзі сталага ўзросту, а за імі падцягнулася і моладзь.

У вёсцы Махнавічы па ініцыятыве старасты на працягу года працавалі з жыхарамі, арганізацыямі, якія замацаваны за сельсаветам. Дзякуючы ім

Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

могілкі, хоць і знаходзяцца ў лесе, але агароджаны, іх даглядаюць. Старшыня Чыжэвіцкага сельскага Савета Галіна Бань шмат папрацавала з жыхарамі вёскі Пагост, дзе вялікую праблему ствараюць старыя дрэвы. Справа зрушылася з месца. У некаторых населеных пунктах людзі збіраюць на ўладкаванне могілак па мільёну і больш рублёў. Разумеюць, што спілаваць дрэва не проста, трэба выклікаць альпіністаў, а гэта дарагое задавальненне. У бюджэтах сельскіх Саветаў на гэтыя мэты сродкі не прадугледжаны.

— У распараджэнні сельскіх Саветаў Салігорскага раёна больш за сотню грамадзянскіх сельскіх могілак. Тыя, што знаходзяцца ў межах аграгарадкоў — а іх у раёне 14 — перададзены на баланс прадпрыемства ЖКГ «Комплекс», — канстатуе Лідзія Клішэвіч. — Для таго, каб перадаць астатнія, неабходна аформіць акты на зямлю, праваўстаноўчыя дакументы. Гэта каштуе немалых грошай. Я нашым старшыням сельвыканкамаў кажу: нават калі іх канчаткова перададзім спецслужбам, гэта не значыць, што вы імі не будзеце займацца. Менавіта вы кантактуеце з людзьмі, арганізуеце з імі суботнікі. У любым выпадку пытанні будуць усё роўна задаваць вам. Тым больш, не ў кожным аграгарадку ёсць жыллёва-камунальная служба. А трымаць чалавека, які б спецыяльна займаўся могілкамі, няма магчымасці.

Некалькі гадоў таму Салігорскі райвыканкам прыняў рашэнне па перадачы ў падпарадкаванне ЖКХ могілак, але пры адной умове: каб яны былі агароджаныя. Гэта і зразумела: служба знаходзіцца ў райцэнтры, а працягласць раёна даволі значная, на яго тэрыторыі знаходзіцца 167 населеных пунктаў. Таму ўладкаваць усе могілкі камунальнікам не пад сілу. Але ў іх ёсць тэхніка. І сёння вываз цвёрдых бытавых адходаў, смецця з могілак, установўка кантэйнераў — абавязак «Экакомплексу». З гэтым прадпрыемствам усе 11 сельскіх Саветаў заключылі адпаведны дагавор.

> “ У некаторых населеных пунктах людзі збіраюць на ўладкаванне могілак па мільёну і больш рублёў.

— Бясспрэчна, хочацца, каб нашы гараджане, вяскоўцы, работнікі сельвыканкамаў актыўней выкарыстоўвалі такі метад, як самаабкладанне, — выказала пажаданне мая суразмоўца. — Гэтыя сродкі ідуць у першую чаргу на добраўпарадкаванне могілак. Такія работы, напрыклад, выконваюцца на тэрыторыі Доўгаўскага сельсавета з удзелам грамадзян. Лічу, калі яны здадуць хоць якія грошы на ўладкаванне могілак, то больш бераўліва будуць ставіцца да зробленага. А што тычыцца парадку непасрэдна на магілах, то гэта, упэўнена, святы абавязак сваякоў, дзяцей. Так, ёсць асобныя магілы, якія ўжо няма каму даглядаць. Не ганебна і суседзям, вяскоўцам іх прыбраць. Але, калі гэтага не зроблена, то наводзяць тут парадак работнікі сельсавета, дэпутаты, школьнікі падчас суботнікаў.

— Лідзія Анатолеўна, у нашых славянскіх традыцыях ставіць на могілках грувасткія помнікі, агароджы, а таксама рэзерваваць участак каля сваякоў і для сябе, што стварае нязручнасці для многіх людзей, калі няма дзе разгарнуцца пахавальнай працэсіі.

— Сёння гэта праблема не столькі сельскіх могілак, як гарадскіх. Браніраванню падлягаюць месцы для бліжэйшых сваякоў — мужа ці жонкі. Дзякуй Богу, што яны пустуюць, няхай людзі жывуць доўга. Але гэтыя свабодныя метры ставяць выканкам перад фактам пашырэння плошчы могілак. Маё патрабаванне да старшынь сельскіх Саветаў: пры рэгістрацыі акта смерці чалавека папярэджваць сваякоў, што пахаванне павінна адбывацца ў межах таго, што ёсць, а не там, дзе захочацца.

Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ. *lazovskaya@zviazda.by*

ПАЧАЛОСЯ... З СОРАМУ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

На сходзе абмеркавалі, што канкрэтна трэба і рэальна зрабіць, прапанавалі жыльцам вызначыцца па колеры фарбаў. Таксама патлумачылі, што памер платы за бягучы рамонт вызначаецца, згодна з Жыллёвым кодэксам Беларусі, зыходзячы з агульнай плошчы кватэры. Такім чынам, для аднапакаёўкі — адна сума, для трохпакаёўкі — іншая. Пасля завяршэння рамонту яна ўключаецца ў «жыроўку», магчымая і растэрміноўка плацяжу. Прычым плаціць абавязаны і тыя жыльцы, якія не давалі згоды на правядзенне рамонту месцаў агульнага карыстання.

...Прыемна адзначыць, што бягучы рамонт у нашым пад'ездзе афарбоўкай сцен і столяў не абмежаваўся. За гэтай ініцыятывай пайшлі і іншыя. Мы аказаліся практычна аднадушнымі ў жаданні замяніць паштовыя скрынкі, якія адслужылі сваё, і адзін з жыльцоў забяспечыў іх пакупку (нядорага), а потым сам устанавіў. Нехта з суседзяў паклапаціўся пра такую «дробязь» для людзей пажылога ўзросту, як зручны поручань пры пад'ёме з уваходу ў пад'езд да ліфта. А нядаўна на лесвічных пляцоўках з'явіліся святільнікі з фоташумавымі датчыкамі, якія спрацоўваюць на нейкі шум — напрыклад, адкрыццё дзвярэй у ліфце. Гэтае энергазберагальнае мерапрыемства правяла жыллёва-камунальная служба, але ж, пэўна, паспрыяла і ініцыятыва жанчыны з нашага пад'езда, якая падрыхтавала адпаведны пісьмовы зварот і сабрала подпісы жыльцоў.

Дарэчы, акрамя лесвічных пляцовак, у нашым доме ёсць і месцы агульнага карыстання для дзвюх кватэр, якія шмат дзе таксама даўно зачакаліся рамонту. Мы з суседзямі, падзяліўшы пароўну фінансавыя затраты, вырашылі навесці парадак і там — пафарбавалі столь і сцены, агульныя дзверы, паклалі новы лінолеум на падлогу.

Праўда, і пасля праведзенага рамонту наш пад'езд цяжка назваць узорным. Так, цяпер ён выглядае даволі прыстойна і хочацца спадзявацца, што да зробленага за свае грошы і стаўленне будзе, як у акуратнага чалавека да ўласных рэчаў. Але заходзіш, напрыклад, у ліфт, а на яго падлозе... Дрэнна прыбіраюць? Але навошта смеціць?

prakopchik@zviazda.by

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ Газета для выбаршчыкаў і дэпутатаў мясцовых Саветаў

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Заснавальнікі: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда».

Дырэктар — галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.

Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **АСКЕРКА Ю.В.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом «Звязда»

АДРАС РЭДАКЦЫІ: 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН: 292 44 12;

e-mail: info@zviazda.by

Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.

Тыраж 20.023. Нумар падпісаны ў 19.30 17 мая 2016 года.

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-12047 (назначение – здание административно-хозяйственное, наименование – административное здание), площадью 124,7 кв.м, расположенное по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422086505101001109 (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания административного здания), площадью 0,0324, расположенном по адресу: Гродненский р-н, Озерский с/с, д. Озеры, ул. Ленина. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в водоохранных зонах водных объектов вне прибрежных полос, код – 2
Начальная цена продажи	409 510 000 (четыреста девять миллионов пятьсот десять тысяч) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	40 951 000 (сорок миллионов девятьсот пятьдесят одна тысяча) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230003, г. Гродно, Озерское Шоссе, 41, тел. 74-68-07
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 02 июня 2016 г. в 14.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 27.10.2015 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 27 мая 2016 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» http://grodnoino.by/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 401/С-11207 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – одноэтажное кирпичное здание магазина), площадью 148,7 кв.м м.п., расположенное по адресу: Гродненский р-н, а.г. Озеры. Составные части и принадлежности: холодная пристройка, сарай, уборная
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422086505101001087 (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), площадью 0,1135, расположенном по адресу: Гродненский р-н, а.г. Озеры. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земли, находящиеся в прибрежных полосах водных объектов, код – 1, площадью 0,1135 га
Начальная цена продажи	710 000 000 (семьсот десять миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	71 000 000 (семьдесят один миллион) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 45-05-38
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	Р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, код банка 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 20 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209 с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 14 июня 2016 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32– Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/

Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки»

ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ ПОВТОРНОГО АУКЦИОНА ПО ПРОДАЖЕ ИМУЩЕСТВА

Наименование	Характеристика
ЛОТ 1	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-79835 (назначение – здание специализированное обрабатывающей промышленности, наименование – здание колбасного цеха), площадью 476,3 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 14Е. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие площадью 468 кв.м, бетонный бортовой камень площадью 61 кв.м, трубопровод напорный протяженностью 328 м.п.
Земельный участок, на котором расположен объект	440100000002001090 (назначение – обслуживание колбасного цеха) площадью 0,1764, расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 14Е
Начальная цена продажи	1 584 000 000 (один миллиард пятьсот восемьдесят четыре миллиона) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	158 400 000 (сто пятьдесят восемь миллионов четыреста тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 2	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-28734 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 235,7 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422080407101000085, площадью 0,0701 га (назначение – земельный участок для эксплуатации и обслуживания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ул. Кстинская, 18
Начальная цена продажи	1 224 000 000 (один миллиард двести двадцать четыре миллиона) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	122 400 000 (сто двадцать два миллиона четыреста тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 4	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-78076 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – магазин), общей площадью 93,1 кв.м, расположенное по адресу: Коптевский с/с, д. Каменка, 9А. Составные части и принадлежности: сарай площадью 27 кв.м, уборная дощатая без выгреба площадью 1 кв.м
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 422084504601000103, площадью 0,0584 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Коптевский с/с, д. Каменка. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0584 га
Начальная цена продажи	200 000 000 (двести миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	20 000 000 (двадцать миллионов) белорусских рублей
ЛОТ 5	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-87058 (назначение – здание специализированное розничной торговли, назначение – здание магазина), общей площадью 89,0 кв.м, расположенное по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А.
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый № 422087505601000080, площадью 0,0366 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: Поречский с/с, д. Лихачи, ул. Школьная, 2А. Земельный участок имеет ограничения (обременения) прав в использовании: земельный участок, находящийся в водоохранной зоне водного объекта, код – 4,1, площадью 0,0366 га
Начальная цена продажи	80 000 000 (восемьдесят миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	8 000 000 (восемь миллионов) белорусских рублей
ЛОТ 6	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-90341 (назначение – здание специализированное розничной торговли, наименование – магазин), площадью 46,1 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16г
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001006831, площадью 0,0199 га (назначение – земельный участок для обслуживания здания магазина), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16г. Составные части и принадлежности: асфальтобетонное покрытие, площадью 36 м.кв.
Начальная цена продажи	288 000 000 (двести восемьдесят восемь миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	28 800 000 (двадцать восемь миллионов восемьсот тысяч) белорусских рублей
ЛОТ 7	
Наименование объекта, краткая характеристика, адрес расположения	Капитальное строение, инв. № 400/С-79015 (назначение – здание специализированное иного назначения, наименование – здание бытовки), площадью 128,4 кв.м, расположенное по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д. Составные части и принадлежности: цементобетонное покрытие площадью 8 м.кв., ограждение из металлической сетки, протяженностью 48,0 м
Земельный участок, на котором расположен объект	Кадастровый номер 440100000001006832, площадью 0,0325 га. (назначение – земельный участок для обслуживания здания бытовки), расположенном по адресу: г. Гродно, ш. Озерское, 16д
Начальная цена продажи	400 000 000 (четыреста миллионов) белорусских рублей с учетом НДС
Сумма задатка	40 000 000 (сорок миллионов) белорусских рублей
Условия аукциона	Без условий
Продавец	Гродненский филиал Гродненского областного потребительского общества, 230001, г. Гродно, ул. Суворова, 298, тел. 96-06-74
Организатор торгов	Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», г. Гродно, ул. Врублевского, д. 3, каб. 209, тел.: 41-98-32, 41-98-34
Условия оплаты	По договоренности сторон
Срок заключения договора купли-продажи	Не позднее 20 рабочих дней с момента подписания протокола аукционных торгов
Номер р/с для перечисления задатка	р/с 3012579170017 в Дирекции ОАО «Белинвестбанк» по Гродненской области, БИК 153001739, УНП 500833225
Аукцион состоится 02 июня 2016 г. в 11.00 по адресу: Гродненская область, г. Гродно, ул. Врублевского, 3, 209	

К участию в аукционе допускаются физические лица, юридические лица и индивидуальные предприниматели, подавшие организатору аукциона в названный в извещении срок заявление с приложением необходимых документов и внесшие в установленном порядке на указанный в извещении текущий (расчетный) счет сумму задатка, получившие билеты участников аукциона с указанием даты регистрации заявления и заключившие с организатором аукциона соглашение о правах и обязанностях сторон в процессе подготовки и проведения аукциона.

Для участия в аукционе в указанный в извещении срок в Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки» подается заявление на участие в аукционе со следующими документами:

заверенная банком копия платежного поручения о внесении суммы задатка на текущий (расчетный) счет, указанный в извещении;

юридическим лицом – резидентом Республики Беларусь – копия документа, подтверждающая государственную регистрацию юридического лица;

индивидуальным предпринимателем – документ, подтверждающий государственную регистрацию индивидуального предпринимателя, и его копия, которая заверяется организатором аукциона;

юридическим лицом – нерезидентом Республики Беларусь – легализованные в установленном порядке копии учредительных документов и выписка из торгового реестра страны происхождения (выписка должна быть подготовлена в течение шести месяцев до подачи заявления на участие в аукционе) либо иное эквивалентное доказательство юридического статуса в соответствии с законодательством страны происхождения; документ о финансовой состоятельности, выданный обслуживающим банком или иной кредитно-финансовой организацией, с удостоверенным переводом на белорусский или русский язык.

При подаче документов на участие в аукционе организатору аукциона предъявляются:

представителем юридического лица, индивидуального предпринимателя – доверенность (документ, подтверждающий полномочия должностного лица) и документ, удостоверяющий личность этого представителя;

физическим лицом – документ, удостоверяющий личность физического лица;

представителем физического лица – доверенность и документ, удостоверяющий личность представителя.

Прием заявлений на участие в аукционе со всеми необходимыми документами заканчивается в установленные организатором аукциона день и время, указанные в извещении. Заявления, поступившие после установленного срока, не рассматриваются. Сроком поступления заявления является дата его регистрации в журнале регистрации заявлений на участие в аукционе. Организатор аукциона имеет право снять предмет аукциона с торгов в любое время, но не позднее чем за 3 календарных дня до назначенной даты проведения аукциона, о чем организатором аукциона извещаются участники аукциона.

В процессе торгов начальная цена повышается аукционистом до тех пор, пока только один участник согласится приобрести предмет торгов. Данный участник объявляется победителем торгов. Если аукцион признан несостоявшимся в силу того, что заявление на участие в нем подано только одним лицом, предмет аукциона продается этому лицу при его согласии по начальной цене, увеличенной на 5 процентов.

Объявление о проведении первого аукциона было размещено в газете «Звязда» от 16.06.2015 г.

Заявления на участие в аукционе принимаются по адресу: г. Гродно, ул. Врублевского, 3, каб. 209, с 8.30 до 17.30 (понедельник – четверг) и с 8.30 до 16.30 (пятница)

Последний день приема заявлений – 27 мая 2016 г. до 15.00

Телефоны для справок: 45-05-38, 41-98-32 – Гродненский филиал РУП «Институт недвижимости и оценки», http://grodnoino.by/

ЗАО «Центр промышленной оценки» информирует:

В извещение о проведении открытого аукциона по продаже **кухни-столовой**, расположенной по адресу: г. Минск, ул. Славинского, д. 4К и принадлежащей ОАО «АЛЕВКУРП», опубликованном в газете «Звязда» от 07.05.2016, вносятся изменения:

1) **Аукцион состоится, читать:** 20.06.2016 в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Мележа, д. 5/2, пом. 1703;

